◂ № 20 (243) ◂ 20 мая ◂ 2011 г.
www.novychas.org

# Новы Час



ЗМІЦЕР ДРОЗД

Стар. 5

**ВАЛЮТНАЕ ПОЛЫМЯ ШУГАЕ ПА ПРАСТОРАХ**

На чорным рынку 18 мая долары можна было прадаць за 6300–7500 рублёў. Назіраецца шакуючы рост цэн і накапленне праблем у эканоміцы

Стар. 6

**ВЫБУХ У КАЗАХСТАНЕ**

Пра версіі, рэакцыю грамадства і ўлады журналіст «НЧ» Алег Новікаў размаўляе з палітолагам з Казахстана Андрэем Грышыным

Стар. 13

**БЕЛАРУСКАЯ КАНАДА**

Стар. 14–15

ISSN 2218-2144
9 772218 214401 10020

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!**

**ВАЛАДАРЫ ДУМАК — ФІЛОСАФ АКУДОВІЧ**

Сустрэча ў рэдакцыі

▸ АД РЭДАКТАРА

## ФОБІІ ЎЛАДЫ




*Аляксей КАРОЛЬ*

**Нагадаем дамінантныя падзеі, што вызначаюць асноўны змест палітычнай сітуацыі ў Беларусі і разам з тым выяўляюць асноўныя фобіі, страхі ўлады.**

Разгон Плошчы 19 снежня 2010 года, суды і прысуды «за Плошчу», несціхаючая хваля арыштаў іператрусаў, забарона на выказванне любой іншай, акрамя афіцыйнай, версіі выбуху ў метро, серыяператрусаў на офісах незалежных СМІ і кватэрах журналістаў, пагроза закрыцця газет «Наша ніва» і «Народная воля», арышт журналіста Андрэя Пачобута па абвінавачванню ў паклёпе на прэзідэнта і, урэшце, кампанія па навядзенню дысцыпліны на прадпрыемствах.

Гэтыя падзеі ёсць адначасова — праяўленні фобіі менавіта ўлады таталітарнага тыпу. Дэмакратычна арганізаваная ўлада таксама мае свае фобіі. Але ні адна з іх не нясе ў сабе страшнага закляцця рэпрэсій. Страта ўлады, перазменка палітычных лідараў і каманд, каналы для выхаду пратэстнай энергіі прадугледжаны ў самой яе канструкцыі.

Гэту канструкцыю беларуская ўладная групоўка свядома адпрэчыла яшчэ ў 1994 годзе, але да 19 снежня 2010 паўсюдна публічна сцвярджала, што створаная імі мадэль — так званая «вертыкаль» — ёсць ні што іншае, як ўвасабленне найлепшай у Еўропе дэмакратыі. Па сутнасці, гэта ёсць пераліцаваная ідэалагема Леніна аб сацыялізме як поўнай, даведзенай да канца дэмакратыі.

Другі класічны таталітарны рэжым, нацыянал-сацыялісцкага гатунку, у сваім прапагандысцкім арсенале карыстаўся іншай формулай — адкрытым адмаўленнем дэмакратыі як прыдумкі плутакратаў для падману народа.

Пасля 19 снежня Лукашэнка публічна адмовіўся ад дэмакратыі. Маскіровачны пакрыў са створанай ім канструкцыі быў скінуты.

Канцэпцыя таталітарнага рэжыму завострана на вечнае існаванне, а значыць, і на пажыццёвае знаходжанне на вяршыні пірамідзі яе творцаў, яе правадыра. Адсюль і ўспрыняцце такім рэжымам пагроз свайму існаванню, што трансфармуюцца ў навязлівыя фобіі, страхі. Гэта — канкурэнты, як у шэрагах уладнай бюракратыі, так і апазіцыі. Любое іншадумства, свабода інфармацыі, свабода слова. І наймацнейшы страх — сацыяльнае незадавальненне ў любых яго формах: ад размоў на кухні да сходаў, мітынгаў і дэманстрацый. Гэта — любыя перамены ў сістэме, бо нават самыя бяскрыўдныя нясуць у сабе пагрозу некантралюемага абвалу.

Брутальны разгон Плошчы — на першы погляд, нечаканы і нематываваны, і нават шкодны для самога рэжыму — быў заканамерным праяўленнем менавіта гэтых глыбінных таталітарных комплексаў. Узросшы на тле, на аскепку савецкага, ён мусіў быў зліквідаваць пагрозы свайму існаванню, якія спакваля кандэнсаваліся і з відавочнай яснасцю выявіліся падчас выбараў.

Рэжым раптам адчуў, што нават жорстка рэгулюемая, імітацыйная дэмакратызацыя прыадчыняе вароты яго аўтарытарнай крэпасці, што ў гэтую шчыліну можа вось-вось лавінай хлынуць натоўп. Не выключана, што мірная дэманстрацыя на плошчы ўладамі сапраўды ўспрымалася як рэальная спроба паўстання. У страху — вялікія вочы.

Свае фобіі любы таталітарны (і нават аўтарытарны) рэжым лечыць хірургічнымі аперацыямі — па ізаляцыі і ліквідацыі сваіх апанентаў, як рэальных, так і патэнцыйных, што яму прымроіліся (знакамітае бальшавіцкае «лес рубят, щепки летят»). Рэфлекторна імкнецца заглушыць свае страхі праз застрашванне грамадства. Розніца толькі ў маштабах ахвяр. Бо чалавек для таталітарнай сістэмы — усяго толькі людскі рэсурс, чалавечы матэрыял. Рацыянальны разлік да абсурду пераплецены з ірацыянальным.

Судовыя працэсы — лагічны працяг разгону Плошчы. Адмовіцца ад судоў азначала б паставіць пад сумнеў 19-га і, галоўнае, вярнуцца хаця б да імітацыйнай дэмакратызацыі палітычнага жыцця краіны. Мэта прысудаў — застрашванне апазіцыі, параліч яе дзейнасці, расправа з канкурэнтамі і адначасова прышчэпка ад вылучэння кандыдатамі ў будучых выбарах любога, апроч прызначаных дзейнай уладай. Ну і, зразумела, палітвязні — закладнікі, той самы чалавечы матэрыял на выпадак магчымага гандлю з Захадам.

З гэтай логікі вынікае і схема арганізацыі судовых працэсаў — разбіўка падсудных на адмыслова сфармаваныя групы, размеркаванне пад розныя артыкулы Крымінальнага кодэкса і пад розныя тэрміны зняволення. Аднак на правядзенне гучнага паказальнага судовага працэсу ўлады не рашыліся. З-за боязі грамадскага рэзанансу. Раскідалі па розных судах, судзяць у невялікіх залах, пры мінімальным асвятленні ў дзяржаўных СМІ. Боязь не без падстаў: па апытанні на партале TUT.BY, сярод праблем, якія найбольш хвалююць грамадства, суды над апазіцыяй былі названы нароўні з «вызваленнем» курса долара. Большасць грамадзян спачувае зняволеным, што выявілася ў моцнай кампаніі салідарнай дапамогі ахвярам Плошчы.

Ці дасягнуў рэжым пастаўленых мэтаў? Часткова і на час. Найбольш, падаецца, у канцылярыі бюракратыі, ліквідацыі ў яе шэрагах любых праяў фронды. Арганізаваная апазіцыя, асабліва партыйная, — сапраўды выглядае паралізаванай, аднак структуры яе захаваліся і пры першых жа прыкметах росту незадавальнення ў грамадстве могуць ажыць, стаць прыцягальнымі для новых людзей. Грамадскія арганізацыі сышлі з палітычнага поля ў больш бяспечныя сферы дзейнасці — культурніцкія, асветніцкія. Але актывізаваліся праваабарончыя арганізацыі.

Не саступіў ані кроку назад, нягледзячы на бесперапынныя затрыманні і арышты актывістаў, у сваёй кампаніі негвалтоўнага супраціву арганізаваны моладзевы рух, той жа «Малады фронт». У моладзевым асяродку ўжо з'явіліся прыкметы радыкалізацыі пратэстных акцый (спробы падпалаў дзяржаўных установаў).

Поўным разгромам апазіцыі, па крытэрах класічных таталітарных мадэлей, з'яўляецца поўная забарона любых апазіцыйных партый і арганізацый з заменай іх імітацыйнымі структурамі. Тое ж адносіцца і да незалежных СМІ.

Аднак на такія крокі ўлады Беларусі пакуль не рашыліся. Бо менавіта яны якраз і могуць зрушыць лавіну сацыяльных і палітычных перамен. Тым больш, што ў краіне разрастаецца ўжо не прывід, а рэальны сацыяльна-эканамічны крызіс.

СУДЫ

# АПЛАДЫСМЕНТЫ Ў СУДЗЕ

Таццяна ШЭЛЕГ

**У апошні дзень перад вынясеннем прысуду ў Фрунзенскім судзе Мінска гучалі апладысменты. Пагрозы суддзі выдаліць з залы прысутных не падзейнічалі.**

З апошнім словам 18 мая выступілі Уладзімір Някляеў, Віталь Рымашэўскі, Наста Палажанка, Аляксандр Фядута, Андрэй Дзмітрыеў і Сяргей Вазняк.

«Не страшна сесці ў турму — страшна апусціць рукі. Я буду дзейнічаць. Наш прысуд у тым, што мы свабодныя. Я не ведаю, колькі яшчэ разоў траплю на лаву падсудных», — заявіла Наста Палажанка.

Ісгэрыя і татальныя суды — вось што, паводле яе словаў, адбываецца зараз у Беларусі. За нежаданне казаць хлусню людзі атрымліваюць ад 2 да 5 гадоў зняволення. «Але нельга адабраць свабоду і веру», — запэўніла Наста. І пажадала «высокаму суду» свабоды.

Віталь Рымашэўскі сказаў, што меў гонар запрашаць людзей на Плошчу. «Але наіўна думаць, што заклікі прывялі людзей на Плошчу. Людзі выйшлі туды змагацца за свабоду, змагацца са страхам, хлуснёй і беззаконнем, што пануюць у краіне. Тое, што зараз адбываецца — жорсткія прысуды, рэпрэсіі, — накіравана на тое, каб людзі больш не выйшлі. Але ўсё будзе наадварот», — лічыць экс-кандыдат.

Віталь Рымашэўскі падзякаваў усім, хто не спужаўся і падтрымліваў яго. Ён будзе рабіць усё магчымае, каб людзі, якіх пакаралі за Плошчу, выйшлі на свабоду.

Аляксандр Фядута «правёў працу над памылкамі». Ён зазначыў, што трэба абломваць асабістыя амбіцыі і слухаць іншых. Штабы кандыдатаў не здолелі дамовіцца. «Мы з Халіп, Саннікавым, Бандарэнкам не размаўлялі з 2007 года. А дарма. Але нашы родныя сустрэліся ў чэргах, каб здаць перадачы ў «амерыканку», — сказаў ён.

Хацелі перамен, але не здолелі дамагчыся. «І справа не ў міністры Куляшове. Справа ў нас. Мы павінны аб'ядноўвацца», — падкрэсліў Аляксандр Фядута.

А Уладзімір Някляеў сказаў: «Я ўдзячны беларусам, якія 19 снежня выйшлі на Плошчу і захавалі годнасць нацыі». Яго прамова завяршыла выступы абвінавачаных. І прысутныя ў зале зладзілі авацыю.

Прысуд будзе абвешчаны 20 мая а 16-й гадзіне.

# РЭКОРДНЫЯ ТЭРМІНЫ

Генадзь КЕСНЕР

**18 мая дзяржаўны абвінаваўца Кірыл Чубкавец агучыў пакаранні, якія ён патрабуе для экс-кандыдатаў у прэзідэнты Мікалая Статкевіча і Дзмітрыя Уса, а таксама яшчэ для пяці ўдзельнікаў падзеяў 19 снежня 2010 года — ад чатырох да васьмі з паловай гадоў пазбаўлення волі ў калоніі ўзмоцненага рэжыму.**

Чубкавец прапанаваў суддзі Людміле Грачовай даць Мікалаю Статкевічу восем год, Дзмітрыю Усу — сем год, Аляксандру Класкоўскаму — восем год і шэсць месяцаў, Андрэю Пазняку, Аляксандру Квяткевічу, Дзмітрыю Буланаву і Арцёму Грыбкову — па чатыры гады зняволення ў калоніі ўзмоцненага рэжыму. Пракурор запатрабаваў для Грыбкова яшчэ і прымусовага лячэння ад алкагалізму.

Фігурантам крымінальнай справы, якая разглядалася ў судзе Ленінскага раёна Мінска, інкрымінавалася арганізацыя (Статкевічу і Усу) альбо ўдзел у масавых беспарадках (часткі 1 і 2 артыкула 293 Крымінальнага кодэкса Беларусі). Максімальнае пакаранне паводле гэтага артыкула КК — да пятнаццаці гадоў пазбаўлення волі.

Выступаючы ў судовых спрэчках, адвакат Мікалая Статкевіча Таццяна Станкевіч выказала ўпэўненасць, што прызнаць вінаватым яе манданта нельга, і па гэтаму артыкулу яго немагчыма прыцягваць да адказнасці. Па словах абаронцы, можна пагадзіцца, што Статкевіч меў адносіны да несанкцыянаванай акцыі 19 снежня.

«Але не магу пагадзіцца, што мой падабаронны мае адносіны да масавых беспарадкаў, якіх з большага не было. Падчас шэсця не было зафіксавана ніводнага факту парушэння парадку, — заявіла Таццяна Станкевіч. — Што да падпалаў, пагромаў і ўзброенага супраціву — то іх не было. Экспертыза дакладна высветліла, што гаручай вадкасці ў бутэльках не было, таму і казаць пра падпалы і нават спробу падпалу немагчыма. Але калі няма зброі, то няма і ўзброенага супраціву. Такім чынам, на плошчы Незалежнасці было толькі несанкцыянаванае мерапрыемства, якое, не буду спрачацца, парушала грамадскі парадак, а таксама лакальныя хуліганскія дзеянні… Мяркуецца, што ў масавых беспарадках мусіць быць намер. Статкевіч прадбачыў, што выбары будуць фальсіфікаваць, і думаў, як гэта прадухіліць. Ён меркаваў, што вялікія сходы людзей паўплываюць на тых, хто лічыць галасы. Пры гэтым ён заўсёды меркаваў, што акцыя будзе мірнай, і пра гэта казаў. Гэтак і на сустрэчы ў Магілёве, якую мы праглядзелі, ён кажа, што мы не плануем гвалту. 30 лістапада па БТ Статкевіч казаў, што акцыя будзе мірнай, як і 24 лістапада. Расцэньваць словы Статкевіча пра тое, што ён хоча «націснуць на ўладу», як заклік да беспарадкаў — няправільна».

Пра непацверджанасць і неабгрунтаванасць абвінавачанняў у дачыненні да свайго падабароннага заявіў і адвакат Дзмітрыя Уса Уладзімір Сазанчук. Іншыя адвакаты таксама папрасілі суд апраўдаць сваіх падабаронных.

Прысуд па справе будзе абвешчаны ў судзе Ленінскага раёна Мінска 20 мая ў 16.00.

# ХАЛІП ПАЗБАВІЛІ ВОЛІ З АДТЭРМІНОЎКАЙ

Генадзь КЕСНЕР

**Да двух год пазбаўлення волі з адтэрміноўкай выканання прысуду прыгаворана судом Заводскага раёна Мінска вядомая беларуская журналістка Ірына Халіп.**



Кіраўнік штаба экс-кандыдата ў прэзідэнты Віталя Рымашэўскага Павел Севярынец асуджаны на тры гады абмежавання волі з накіраваннем для адбывання пакарання ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу. Кіраўнік штаба яшчэ аднаго прэтэндэнта на вышэйшую дзяржаўную пасаду Мікалая Статкевіча Сяргей Марцалеў прыгавораны да двух год пазбаўлення волі ўмоўна.

Такі вердыкт агучыла раніцай 16 мая суддзя Жана Брысіна, якая цалкам пагадзілася з патрабаваннем дзяржаўнага абвінаваўцы. Згодна рашэння суда, Паўла Севярынца і Сяргея Марцалева, якія да вынясення выраку знаходзіліся ў следчым ізалятары КДБ, а таксама Ірыну Халіп, якая апошнім часам была пад хатнім арыштам, вызвалілі наўпрост у зале суда. Дзясяткі людзей, большасць з якіх не змагла патрапіць у залу і пачуць прысуд, у калідоры сустрэлі палітвязняў гучным «Жыве Беларусь!» і апладысментамі.

Ірына Халіп найперш падзякавала сваім бацькам і маці свайго мужа, на долю якіх, па словах Ірыны, за гэты час выпалі нечалавечыя выпрабаванні. «Не мы, а нашы бацькі сапраўдныя героі», — падкрэсліла журналістка, якая шчыра падзякавала і сваім калегам па прафесійным цэху за падтрымку яе сям'і ўвесь час пасля 19 снежня.

Па словах журналісткі, вынесены ёй прысуд можна параўнаць з узяццем у закладнікі, бо за самае нязначнае парушэнне яна можа зноў апынуцца ў вязніцы. А праз два гады яе зноў будуць судзіць, каб вызначыць, ці выправілася яна, і тады зноў будзе вырашацца лёс журналісткі.



Павел Севярынец, падзякаваўшы ўсім прысутным за падтрымку і салідарнасць, абняўся з блізкімі, найперш з маці Таццянай, пасля чаго літаральна паляцеў у суд Фрунзенскага раёна, дзе судзяць іншых «палітычных», у тым ліку яго паплечніцу Насту Палажанку. Сяргей Марцалеў сказаў, што пасля выхаду з-за кратаў будзе змагацца за вызваленне асуджаных палітзняволеных.

І самі асуджаныя, і праваабаронцы, і адвакаты лічаць вынесеныя 16 мая прысуды незаконнымі і несправядлівымі, таму вырак суддзі Брысінай цягам дзесяці дзён мае быць абскарджаны ў вышэйшую судовую інстанцыю.

Яшчэ ў панядзелак Ірына Халіп і маці Андрэя Саннікава Ала Уладзіміраўна атрымалі дазвол на сустрэчу з мужам і сынам. Аднак сустрэчы гэтай не адбылося. Як распавяла Ірына Халіп калегам-журналістам, раніцай 18 мая жанчыны прыйшлі ў КДБ, дзе ў іх прынялі заявы з судовым дазволам, забралі пашпарты і загадалі чакаць: «Праз паўгадзіны нам сказалі: ніякіх спатканняў сёння не будзе, прыходзьце заўтра. Ала Уладзіміраўна яшчэ хацела перадаць Андрэю перадачу, і мы пайшлі ў суседні будынак, дзе перадаюць перадачы. І там ёй сказалі, што перадачу ў яе ўзяць не могуць, бо Андрэя ўжо некуды павезлі з «амерыканкі». Мы тады пабеглі на Валадарку, бо ўсіх з «амерыканкі» пасля прысуду могуць павезці толькі туды. Але на Валадарцы яго ў спісах таксама няма, у маёй прысутнасці жанчына ў рэгістратуры, у акенцы паглядзела ў картатэцы і сказала: Саннікава не было, не паступаў. Потым мы патэлефанавалі ва ўсялякі выпадак у СІЗА Жодзіна. Туды яго таксама не прывезлі. Так што мы нічога не ведаем, дзе ён, што з ім», — сказала Ірына Халіп.

Пазней журналістка стэлефанавалася з дзяжурным КДБ, які паведаміў Ірыне, што Саннікаў знаходзіцца ў следчым ізалятары, але СІЗА КДБ, маўляў, не мае ніякага дачынення да самога Камітэта дзяржбяспекі. Дзяжурны не змог патлумачыць, чаму ў СІЗА жанчын увялі ў зман, і параіў разбірацца з кіраўніцтвам ізалятара.

КРУГЛЫ СТОЛ

# МУЗЫКІ — ЗА АБАРОНУ ЖЫВЁЛ

Альбіна ВІШНЕЎСКАЯ

**Беларускія творцы будуць змагацца за прыняцце гуманнага закона аб абыходжанні з жывёламі. Пра гэта яны заявілі падчас круглага стала, які адбыўся ў Мінску 18 мая.**

Ініцыятарам сустрэчы выступіла Беларуская музычная альтэрнатыва. Удзел у сустрэчы ўзялі музыкі Алег Хаменка (гурт «Палац»), Ганна Хітрык (гурт «Sunduk») і Сяргей Рудзеня (гурт «Дзявяты міліметр»). Ад зоаабаронцаў — арганізацыі «Абаронім жыццё», «Зоасвятло» і «Эгіда».

У Беларусі дагэтуль няма закона аб абароне жывёл ад жорсткага абыходжання. Законапраект, які зараз распрацоўваецца міністэрствамі, не задавальняе зоаабаронцаў. Бо зарыентаваны на вырашэнне праблемы бяздомных жывёл шляхам іх адлову. То бок забойства, бо дзяржаўных прытулкаў для жывёл у Беларусі няма.

Прапановы зоаабарончых арганізацый, як было заяўлена на круглым стале, чыноўнікі ігнаруюць. «Мы катэгарычна супраць такога праекту. «Эгіда» гатова аж да таго, што мы будзем пікетаваць гэты закон», — заявіла кіраўнік «Эгіды» Наталля Бялянава.

Удзельнікі сустрэчы вырашылі накіраваць зварот у дзяржаўныя органы ўлады з патрабаваннем гуманізаваць законапраект і ўключыць у яго распрацоўку грамадскасць.

Сяржук Лісічонак, прадстаўнік Асамблеі НДА, адзначыў, што і абаронцы жывёл, і дзеячы мастацтва цалкам знайшлі ўзаемаразуменне. Паводле яго словаў, сітуацыя з тым, як зараз рыхтуецца законапраект «Аб абыходжанні з жывёламі», непрымальная.

«У звароце да ўлады будуць выказаны асноўныя палажэнні, якія абураюць шырокія колы грамадскасці, і патрабаванне змяніць іх на цывілізаваныя. А таксама патрабаванне, каб зрабіць дзейнасць працоўнай групы над законапраектам адкрытай. Для таго, каб голас грамадзянскай супольнасці быў і пачуты, і прыняты», — зазначыў Сяржук Лісічонак.

Музыкі выказалі гатоўнасць распаўсюджваць пасланні ў абарону жывёл. І агучваць іх падчас сваіх канцэртаў. «Мы можам артыстаў абысці, яны абавязкова падпішуцца пад зваротам, — сказала Ганна Хітрык. — Усіх знаёмых музыкаў я з задавальненнем абыду. Можам раздаваць улёткі перад канцэртамі і заклікаць падпісвацца гледачоў. Змяшчаць інфармацыю на свае сайты. І таксама мы гатовы ўдзельнічаць у дабрачынных мерапрыемствах.

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# НЕДАЛЁКА ДА КАНЦА?

Сяргей САЛАЎЁЎ

**Здаецца, да канца падыходзяць суды па справе аб масавых беспарадках 19 снежня 2010 года. Ужо асуджаны на пяць гадоў узмоцненага рэжыму Андрэй Саннікаў, на тры гады «хіміі» — Павал Севярынец, з умоўнымі тэрмінамі на волю выйшлі Сяргей Марцалеў і Ірына Халіп, атрымалі свае гады шараговыя ўдзельнікі Плошчы. На час напісання матэрыялу скончыўся працэс Някляева-Рымашэўскага-Фядуты-Вазняка-Палажанкі-Дзмітрыева, з апошнімі словамі выступаюць на працэсе Уса-Статкевіча.**



Дзіўна, што суды як з ланцугу сарваліся. Калі Саннікава пачалі судзіць 27 красавіка, а скончылі толькі 14 мая, то суд над ягонай жонкай Ірынай Халіп і яе паплечнікамі заняў усяго тры дні. Цікава, куды так спяшаюцца?

У прынцыпе, ясна, куды. І, пэўна, справа тут не толькі ў нейкіх палітычных захадах. Прыкладам, паспець пасадзіць усіх да прыезду Пуціна, які адбыўся 19 мая. Ці пасадзіць усіх да наступнага тыдня, да абмеркавання «беларускага пытання» ў Савеце ЕС, каб было чым гандляваецца. Можа, суддзі кіруюцца адным і простым матывам: нікому не хочацца «завіснуць» у душнай судовай зале летам, якое, як вядома, наступае ўжо праз дзесяць дзён. А да сезону адпачынкаў трэба ж яшчэ і прэмію атрымаць за бездакорна выкананыя загады.

Вось толькі наўрад ці такая паспешлівасць будзе на карысць усёй беларускай дзяржаве.

Канешне, крышачку падсаладзіў сітуацыю Генеральны сакратар Савета Еўропы Турб'ёрн Ягланд. 17 мая на прэс-канферэнцыі па выніках перамоў з кіраўніком МЗС РФ Сяргеем Лаўровым ён не выключыў у перспектыве ўступленне Беларусі ў Савет Еўропы. «Еўропа не абмяжоўваецца краінамі — сябрамі ЕС. У яе ўваходзяць у нашым разуменні 47 краін. Спадзяюся, хутка гэтая колькасць павялічыцца да 48 за кошт далучэння Беларусі», — заявіў Ягланд.

Чым бы дзіцё не цешылася, абы не рукамі. Асабліва, накont «хуткага» ўступлення Беларусі ў гэтую структуру. Па-першае, абавязковая ўмова для ўступлення ў Савет Еўропы — мараторый на смяротнае пакаранне ці поўная яго забарона. Гэтага ніхто ў Беларусі рабіць не збіраецца. Усе абмеркаванні гэтага пытання былі на ўзроўні «пасядзелі — патрындзелі — разышліся». Ужо другі год праваабаронцы праводзяць кампанію па адмене смяротнага пакарання, а вынікаў — з гулькін нос.

Па-другое, сяброўства Беларусі ў Савеце Еўропы аўтаматычна азначае, што беларускія грамадзяне атрымліваюць права звяртацца ў Еўрапейскі суд па правах чалавека. А ягоныя рашэнні для краін — сябраў СЕ абавязковыя, у адрозненне ад Камітэта па правах чалавека ААН, на якія можна і наплюваць. Хіба хто хоча ва ўладзе, каб усе, асуджаныя за Плошчу, масава звярнуліся туды? Пытанне рытарычнае, на вялікі жаль.

А тым часам у Брусэлі вывучаюцца магчымыя эканамічныя санкцыі ў дачыненні да Беларусі. Пра гэта паведамляе бельгійскае выданне «Euobserver» са спасылкай на дыпламатычную крыніцу. Кіраўнікі пасольстваў краін ЕС у Мінску ўжо адправілі ў Брусэль папярэдні спіс асоб і прадпрыемстваў, у дачыненні да якіх разглядаецца магчымасць увядзення новых абмежавальных мер, паведамляе «Euobserver». У гэтым спісе, у прыватнасці, дзяржканцэрн «Белнафтахім», група кампаній «Трайпл», кампанія «Белтэхэкспарт» і ААТ «Беларуськалій».

«Гэты спіс яшчэ не знаходзіцца на стадыі рэалізацыі: пакуль ён базуецца на сведчаннях накшталт «ён сказаў/яна сказала». Мы павінны быць упэўненыя ў тым, што гэтыя кампаніі сапраўды належаць тым людзям, пра якіх мы думаем. Санкцыі ўводзяцца паступова, каб мы маглі аказваць націск у адказ на развіццё сітуацыі», — цытуе «Euobserver» еўрапейскага дыпламата.

Брусэльскае выданне зазначае, што новыя санкцыі «павінны ўдарыць па дзяржаўным бюджэце прэзідэнта Лукашэнкі, не прыносячы крызісу ў кволую эканоміку краіны».

«Але наўрад ці гэта нанясе ўрон прыватнаму капіталу прэзідэнта, які, паводле чутак, асядае ў расійскіх і ўкраінскіх банках, кампаніях, занятых у рыбным бізнэсе, будаўніцтве і продажы нерухомасці, а таксама на афшорных рахунках у Расіі і адной з краін ЕС, — гаворыцца ў артыкуле. — Неабходна сур'ёзная разведвальная аперацыя для таго, каб адсачыць гэтыя грошы. І пакуль ніводная краіна Еўрасаюза не гатова выдзеліць сродкі для вырашэння такой задачы».

Спіс можа быць гатовы ўжо да наступнага пасяджэння Савета міністраў ЕС па замежных справах, якое пройдзе ў Брусэлі 23 мая.

На гэтым фоне застаецца толькі чарговы раз падзівіцца аптымізму беларускага кіраўніцтва. Беларусь не выключае магчымасці звароту па крэдытную падтрымку да Міжнароднага валютнага фонду. Пра гэта заявіў прэм'ер-міністр Міхаіл Мясніковіч 17 мая падчас даклада Аляксандру Лукашэнку. «Але гэта працэс дастаткова працяглы. У чэрвені будзе чарговая планавая місія гэтага фонду ў Беларусі. Мы не гэтыя пытанні будзем абмяркоўваць, але ў залежнасці ад той справаздачы, якая будзе падрыхтавана місіяй МВФ, мы можам прагназаваць далейшае развіццё падзей у адносінах з гэтай аўтарытэтнай міжнароднай арганізацыяй», — сказаў прэм'ер.

З'есці, ён, можа б, і з'еў, але ж хто яму дасць? На фоне рэзка негатыўнай рэакцыі Захаду на становішча з палітычна матываванымі прысудамі ў Беларусі ніякага крэдыту МВФ нам не свеціць. Тым больш, што аналітыкі параўноўваюць сённяшнюю Беларусь з амаль збанкрутаванай у выніку фінансава-эканамічнага крызісу Грэцыяй. Але ў той час, калі ЕС прадставіў Грэцыі антыкрызісную дапамогу ў памеры 147 мільярдаў долараў, Беларусі ніхто дапамагаць не збіраецца. Нават Расія, што б там ні казаў беларускі прэзідэнт. Купіць што-небудзь «непатрэбнае», кшталту «Белтрансгаза», — калі ласка, а крэдыт даць — не.

А пакуль праблемы Беларусі — як знешнія, так і ўнутраныя — плануецца вырашаць звыклым спосабам навешвання локшыны на вушы даверлівай часткі насельніцтва.

У Беларусі неабходна паляпшаць якасць інфармацыйна-аналітычных тэлепраграм, заявіў намеснік міністра інфармацыі Аляксандр Слабадчук 16 мая на прэс-канферэнцыі ў Мінску. Паводле яго слоў, гэта тычыцца ўсіх тэлеканалаў, як агульнанацыянальных, так і рэгіянальных.

Асабліва неабходна паляпшаць якасць праграм, якія тычацца фінансава-эканамічных пытанняў, мяркуе чыноўнік. Ён лічыць, што гэта дазволіць навучаць бізнэсмэнаў. «Неабходна, каб у нас былі магутныя сур'ёзныя праграмы, і банкіры, бізнэсмэны маглі глядзець такія праграмы», — сказаў Слабадчук. Па яго меркаванні, вельмі важна таксама выкарыстоўваць новыя прыёмы пры тэлевізійным асвятленні пытанняў сацыяльнай палітыкі, «каб не было збітасці».

Толькі вось даверлівых сярод насельніцтва застаецца ўсё менш і менш.

## ФІГУРЫ ТЫДНЯ

### ЯЎГЕН ЛІПКОВІЧ



Вядомага блогера Яўгена Ліпковіча пакаралі за «абразу» Мікалая Чаргінца. Блогера прызналі вінаватым у «наўмысным прыніжэнні гонару і годнасці асобы, выяўленым у непрыстойнай форме» (ч. 3 арт. 9 Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях) і прысудзілі да штрафу ў 15 базавых велічынь (525 тысяч рублёў).

Падставай для вынясення штрафу паслужыў зварот у суд Чаргінца за тое, што 19 сакавіка 2011 года ў Севастопальскім парку сталіцы Ліпковіч публічна спаліў кнігі Чаргінца. Ліпковіч у судзе заявіў, што ў студзені 2010 года ён купіў два асобнікі кнігі Чаргінца «Таямніцы авальнага кабінета». Адзін з іх ён меў намер падарыць каму-небудзь. Але ў кнізе блогер знайшоў «вельмі шмат непрыстойнага». Ён заявіў, што праз год пасля набыцця кніг яго дачка навучылася чытаць. Калі Ліпковіч убачыў, што дачка ўзяла пачытаць кнігу «Таямніцы авальнага кабінета», ён адабраў яе, з-за чаго дачка пакрыўдзілася на яго. «Мала таго, што я сам пакутаваў і перажываў, калі чытаў «Таямніцы авальнага кабінета», дык зараз гэтая кніга стала прычынай крыўды на мяне дзіцяці», — цытуе Яўгена Ліпковіча БелаПАН. Блогер у судзе зачытаў апісанні асабліва непрыстойных сцэн, якія змяшчаюцца ў кнізе, і растлумачыў, што ён вырашыў «утылізаваць сваю ўласнасць вядомым традыцыйным спосабам» — спаліў яе ў Севастопальскім парку, каб яна не трапіла ў рукі яго дачкі.

Яўген Ліпковіч мае намер абскардзіць прысуд суда Першамайскага раёна ў Мінскім гарадскім судзе на працягу 10 дзён. «Акрамя таго, я маю намер падаць некалькі заяваў. Адну з іх — у камісію па прадухіленні гвалту, жорсткасці і парнаграфіі пры Міністэрстве культуры, каб яны вынеслі рашэнне, ці ёсць у кнігах Чаргінца элементы парнаграфіі. Па-мойму, гэта доказу не патрэбуе», — мяркуе Ліпковіч.

### СЯРГЕЙ АЎЧЫННІКАЎ



Галоўным трэнерам сямігазовага чэмпіёна Беларусі па футболе прызначаны экс-галкіпер зборнай Расіі, маскоўскіх «Лакаматыва» і «Дынама», Сухумскага «Дынама», партугальскіх «Бенфікі», «Алверка» і «Порту» 40-гадовы Сяргей Аўчыннікаў, — піша «Салідарнасць». На пачатку 2007 года Аўчыннікаў паспрабаваў вярнуцца ў «Лакаматыў», але атрымаў адмову галоўнага трэнера Анатоля Бышоўца. Сяргей пpыняў рашэнне завяршыць кар'еру гульца і пайшоў вучыцца ў Дзяржаўны ўніверсітэт кіравання на кафедры «Менеджмент у гульнявых відах спорту». Паспяхова абараніўшы дыплом, Аўчыннікаў вярнуўся ў «Лакаматыў» у якасці трэнера. Аднак у трэнерскі штаб Анатоля Бышоўца ён не ўвайшоў і атрымаў пасаду «клубны трэнер брамнікаў».

У сезоне 2007 года справы ў чыгуначнікаў складваліся вельмі дрэнна. Нягледзячы на перамогу ў Кубку Расіі, у чэмпіянаце каманда заняла самае нізкае месца ў сваёй расійскай гісторыі — 7-е. Аўчыннікаў на працягу сезона падвяргаў рэзкай крытыцы галоўнага трэнера, а пасля яго звальнення ў лістападзе выказаўся накont свайго жадання ўзначаліць «Лакаматыў». У снежні 2007 года Сяргей Аўчыннікаў па запрашэнні былога прэзідэнта і галоўнага трэнера «Лакаматыва» Юрыя Сёміна ўвайшоў у трэнерскі штаб кіеўскага «Дынама», з якім у маі 2008 года заваяваў серабро чэмпіянату Украіны. Далейшая праца Аўчыннікава на пасадзе трэнера таксама ведала перамогі і паразы.

Дарэчы, першы матч пад кіраўніцтвам Аўчыннікава мінскае «Дынама» прайграла салігорскаму «Шахцёру» з лікам 0:2.

### ЮРЫЙ ШАЎЧУК



Расійскі музыка Юрый Шаўчук, лідар культавага гурта «ДДТ», падпісаў шэраг паштовак для людзей, якія знаходзяцца ў вязніцах, каго судзяць за ўдзел у акцыях пратэсту 19 снежня.

«Мне падабаюцца людзі, што маюць унутраную свабоду, — сказаў музыка ў сваім відэазвароце. — А гэтыя хлопцы маюць галоўнае. Свабода — важная рэч для чалавека. Як напісаў калісьці Сартр, кожны чалавек асуджаны быць свабодным... Не бывае дэмакратыі правай, левай або суверэннай свабоды ці свабоды па ўзору Лукашэнкі. Яна або ёсць, або яе няма... Гэтыя хлопцы — вельмі годныя людзі, я проста перад імі схіляюся, як і многія людзі тут, у Расіі... Я жадаю мужнасці, разумею, як гэта цяжка. Але з іншага боку — вы не адны. У мяне песня ёсць «Ты не адзін». Думаю, усё будзе нармальна. Улада, якая так абыходзіцца са сваімі свабоднымі грамадзянамі, яна баязлівая. А гэта ўжо не пракол. Гэта вялікая чорная дзірка на яе целе, у якой яна і распусціцца».

ТРАГЕДЫЯ

# ПЫТАННІ ЗАСТАЮЦЦА

Вольга ХВОІН

**Ад 11 красавіка, калі здарыўся выбух у мінскім метро, загінулі і былі пакалечаныя людзі, прайшло больш за месяц. Ужо праз два дні прадстаўнікі ўлады заявілі, што злачынца затрыманы. Але чым больш часу мінае, тым менш інфармацыі пра ход следства.**





Пад вартай знаходзяцца два чалавекі, якія маюць дачыненне да здзяйснення тэракту. Генеральны пракурор Рыгор Васілевіч паведаміў, што ім прад'яўленае абвінавачванне. «Нічога адносна новага аб матывах тых, хто ўчыніў злачынства, сказаць нельга. Якія можа быць матыў у чалавека, які здзяйсняе асабліва цяжкае злачынства? Чалавек разумны, але мазгі набакір — гэта несумненна», — цытуе генпракурора БелаПАН. Не бачаць следчыя за абвінавачваемым і палітычных сілаў. «У бліжэйшыя месяц-два будзе ясна, калі справа будзе перададзеная ў суд», — сказаў Васілевіч.

Цягам месяца сілавікі правялі аперацыю «Арсенал» і канфіскавалі больш дзвюх тысяч адзінак зброі, больш 20 кілаграмаў выбуховых рэчываў. «Шманалі» школы, музеі, ваенныя часткі, падвалы.

У Віцебску (дзе жылі падазраваныя) зачыстка мела не меншы маштаб. Аднак, як цытуе праваабарончы цэнтр «Вясна» супрацоўнікаў ЖКГ Першамайскага раёна Віцебска, ніякіх лабараторый у падвалах жылых дамоў яны не бачылі. «Вось глядзіце, але тут нават лямпачкі няма! Асцярожна, пад нагамі лужына! Тут заўжды вільгаць, трубы цякуць, смурод стаіць… На кожную кватэру — катушок два на два метры і рассохлыя дзверы з негабляваных дошак. Якая лабараторыя, калі тут без процівагаза гадзіну не пратрываеш! Смешна слухаць такія выступы па тэлебачанні!» — цытуе «Вясна» словы мясцовага жыхара.

Аляксандр Лукашэнка заявіў, што абвінавачваемы рыхтаваў выбухі ў цягніку, на прыпынку і ў аўтобусе. «Гэты чалавек асвоіў гэта рамяство, бачыў усё па тэлебачанні і вывучыў у інтэрнэце, гэта з яго паказанняў. Ён упершыню гэта ўбачыў там. Думаю, што сёння можна пра гэта сказаць», — цытавала напрыканцы красавіка Лукашэнку дзяржаўнае агенцтва БелТА. Цікава, што на пачатку былі заявы, нібы выбух у метро зладзілі тыя, «каму было выгадна падарваць спакой у краіне». Праз тыдзень пасля заявы Лукашэнкі, што выканаўца выбуху — хімік-аматар, з'явілася інфармацыя на расійскім сайце Life News быццам бы галоўны абвінавачаны па справе аб выбуху ў мінскім метро быў збіты, магчыма, сукамернікамі. У КДБ гэтую інфармацыю абвергілі. Аднак абвінавачваемага жывым і здаровым прэсе не прад'явілі.

Расследаванне справы аб выбуху ў метро выклікае мноства пытанняў у юрыстаў. Вось як каментуе тое, што адбылося, былы следчы, праваабаронца **Алег Волчак:**

— У Беларусі ўпершыню здарылася такое маштабнае злачынства. І, мяркую, у следства не было адмысловага падыходу да расследавання. На першай стадыі органы папярэдняга расследавання не зусім правільна абралі тактыку. Мяне збянтэжыла, што першыя каментары давалі кіраўнік дзяржавы, міністр МУС Куляшоў, старшыня КДБ Зайцаў, і ўсе мелі розныя пазіцыі. А ў адпаведнасці з Крымінальна-працэсуальным кодэксам па справе могуць даваць каментары ці кіраўнік следчай групы, ці пракурор, што здзяйсняе нагляд за справаю. Бянтэжыць, чаму давалі каментары, што не стасуюцца, быццам улады хацелі запэўніць людзей у правільнасці афіцыйнай версіі, што хлопец, які цяпер праходзіць як абвінавачваемы па справе, дакладна здзейсніў гэтае злачынства.

За любым тэрарыстычным актам стаіць мэта, тэракты не робіцца бязмэтава. Звычайна тэрарыст хоча дабіцца адстаўкі нейкага чына, выканання пэўнай умовы. А афіцыйныя каментатары сцвярджаюць, што ніякай падаплёкі няма. У такім разе гэта іншая кваліфікацыя — 139 артыкул Крымінальнага кодэкса — забойства, асабліва небяспечным спосабам, з хуліганскіх памкненняў, што прывяло да гібелі некалькіх асобаў.

Прайшоў месяц, але мы не пабачылі публічнага выступу абвінавачваемага, яго матывацыі. Васілевіч сказаў, што гэты хлопец нармальны, але, маўляў, з хворай галавой. Як такое можа быць? Пасля апошняга звароту родных затрыманых, што інфармацыя не даходзіць, што адвакаты адмаўляюцца працаваць, таксама застаецца мноства пытанняў.

Мае знаёмыя аўганцы-сапёры гавораць, што гэтую выбухоўку наўрад ці можна было зрабіць у хатніх умовах. Рэчыва вельмі «пяшчотнае», ад любых штуршкоў яно можа ўзарвацца. А на відэа з метро паказваюць чалавека, які свабодна нясе сумку, перакідвае яе на плячо. Сказалі, што хлопец усяму навучыўся ў войску.

Уявім, што хлопец разабраўся з гэтымі тэхнічнымі тонкасцямі. Але дзе ён узяў усе матэрыялы для выбухоўкі? Іх жа не на рынку купляюць… У воінскіх частках, дзе рэчывы, дэталі механізму магчыма было дастаць, заўжды ёсць агенты спецслужбаў. Яны б ужо даўно «злілі» такога пакупніка. На відэа з метро, якое нам паказвалі, няма дакладнай карцінкі, як абвінавачваемы ставіць сумку з выбухоўкай на пероне. Ды і маці яго на відэа па хадзе не пазнала.

Да расследавання запрасілі экспертаў з Ізраілю і ФСБ. Але ніхто з іх не зрабіў афіцыйнага заключэння. Ёсць дзве версіі: яны зразумелі, што гэта была за выбухоўка, і з афіцыйнай версіяй яна ніяк не стасавалася, або ім прадставілі абмежаваныя матэрыялы. Ізраільскія эксперты маюць высокі аўтарытэт, і яны наўрад ці пайшлі б на нейкі кампраміс, што паставіў бы пад сумнеў іх кампетэнтнасць і рэпутацыю. Уцямных адказаў ад ФСБ мы таксама не пачулі. Дарэчы, нашае крымінальна-працэсуальнае заканадаўства не дазваляе прадстаўляць інфармацыю па справе, калі чалавек не з'яўляецца экспертам па беларускаму заканадаўству. То бок патрэбныя ліцэнзія, допуск.

Бянтэжыць, што за гэты месяц улады ўкінулі многа версій здарэння, увесь час спрабуюць замкнуць на гэтым хлопцы. Але раптам ён ёсць толькі выканаўцам, то атрымліваецца, што замоўцу, яго хаўруснікаў не шукаюць. Значыць, застаецца крыніца небяспекі. Абвінавачваемага прадстаўляюць як ненармальнага, але з маёй практыкі псіхічна няўстойлівыя людзі рэдка здольныя на такія маштабныя дзеянні. Цагліну на галаву кінуць ці машыну спаліць — вось што для іх нармальна. А тут — ён ладзіць выбух, потым едзе на старую кватэру, як ні ў чым ні бывала п'е са знаёмым.

Праваабаронцы не выгароджваюць гэтага чалавека. Але трэба дамагацца выканання законнасці, каб абвінавачваемы ў судзе быў у адэкватным, нармальным стане. І ўрэшце меў адвакатаў, што гарантуецца заканадаўствам. Усё ж яму пагражае смяротная кара, і памылкі дапусціць нельга.

11 КРАСАВІКА

# ДАБРАЧЫННЫ ДЖАЗ

Ева ВАЙТОЎСКАЯ

**А 7-й вечара, калі канцэрт ужо мусіў пачацца, грошы толькі крыху прыкрылі дно празрыстай урны для ахвяраванняў. 15 мая ў Мінску адбыўся дабрачынны канцэрт у падтрымку ахвяраў тэракту ў мінскім метро.**



Джаз-рок канцэрт для маральнай і матэрыяльнай падтрымкі людзей, якія найгорш пацярпелі ад страшнага выбуху, меў хутчэй прыватны характар. Яго арганізатарам выступіў Павел Аракелян — малады джазмэн, лідар музычнага праекта «The Outsiders». Да незвычайнай у беларускіх умовах ініцыятывы далучылася каля 100 людзей творчай прафесіі. З музыкаў і спевакоў — Нака, Аляксандр Памідораў, Святлана Шэіна, Яўген Глебаў, Іван Кірчук і этна-трыа «Тройца», гурт «Акана». З паэтаў — Уладзімір Арлоў, Алесь Разанаў, Анатоль Івашчанка, Вольга Гапеева і Віталь Рыжкоў. Правяла вечарыну Народная артыстка Беларусі Зінаіда Бандарэнка.

Пры ўсім узроўні і цеплыні вечару ён меў вобмаль старонніх назіральнікаў. Большасць людзей у зале былі арганізатары, удзельнікі або журналісты. Паломніцтва «простых смяротных» — тысяч тых, хто яшчэ месяц таму голасна спачуваў пацярпелым у сеціве і налева-направа абвінавачваў сяброў і знаёмых у цынізме, чэрствасці і «скоку на касцях», — не назіралася. Як заўжды: сышла эмацыйнасць моманту — засталася штодзённая неабходнасць падтрымаць чалавека ў бядзе. Нягледзячы на даволі шырокую рэкламу ў інтэрнэце, людзей прыйшло даволі мала.

Спрацавалі, трэба думаць, два фактары. Па-першае, недавер беларусаў да ўсяго, што адбываецца навокал выбуху. Сумная тэма абрасла столькімі спекуляцыямі, што ў інтэрнэце можна было сустрэць, напрыклад, такія заўвагі: «Я б пайшоў на канцэрт, калі б быў упэўнены, што сродкі сапраўды будуць накіраваныя пацярпелым і іх сем'ям. Можна падумаць, што пацярпелыя атрымаюць болей за сумы, вызначаныя прэзідэнтам… Аналізуючы інфармацыю, звязаную з 11 красавіка, складваецца ўражанне, што нехта (сам ведаеце, хто) хоча нажыцца на гэтай трагедыі за кошт людзей, якія жадаюць дапамагчы пацярпелым».

Па-другое — ужо даўся ў знакі эканамічны крызіс. Беларусы адчувальна пабяднелі. На ўваходзе ў клуб прадаваліся дыскі і кнігі. Пакупнікам прапаноўвалі ўспрымаць іх як падарунак за фінансавую дапамогу — грошы ад продажу сыпаліся ў тую ж празрыстую урну. Але ўсё адно лунала атмасфера кірмашу: «А чаму так дорага?» Адзіным выключэннем сталі кнігі Уладзіміра Арлова: за іх прасілі сімвалічны (на сёння) кошт у 5 тысяч беларускіх рублёў, але чытачы давалі і 10, і 20...

Калі адвыступаў апошні пункт дабрачыннай праграмы — тыя самыя «Аўтсайдэры», — арганізатары акцыі падлічылі паступленні ў празрыстую урну. Выйшла — 4 мільёны беларускіх рублёў. Прычым ладная частка гэтай сумы паступіла ў канверце і была падарункам ад аднаго з беларускіх СМІ, кіраўніцтва якога яўна мае ўяўленне пра еўрапейскі фармат дабрачыннасці.

4 мільёны — многа ці мала? Гэтую «мізэрную» суму, якая ўжо нават не тысяча долараў — абсмяялі ў тым жа самым інтэрнэце, у якім так роспачна спачувалася месяц таму ахвярам... Але арганізатары задаволеныя. Магло быць і горш... Не варта забывацца, што трагедыя адбылася не дзе-небудзь, а ў Беларусі. Ужо сам факт, што свае дапамагаюць сваім, без прыкладу ці пасрэдніцтва замежных гуманітарных фондаў, — пасяляе надзею.

Сабраныя грошы музыкі перадалі сваякам Ярaслава Пясэцкага, які пазбыўся абедзвюх ног, але папраўляецца і мае шанец зноў хадзіць (на пратэзах), і Андрэя Ільіна — лекара па прафесіі, які пасля выбуху аслеп, перанёс некалькі складаных аперацый, але не страціў надзею на вяртанне зроку.

ЛЁС

# ПРОСТЫ ЧАЛАВЕК У ВЯЛІКАЙ ПАЛІТЫЦЫ

Таццяна ШАПУЦЬКА

**Гісторык Зміцер Дрозд заўважна выдзяляўся сярод сваіх паплечнікаў па няшчасці падчас судовага працэсу: энергічны, востраязыкі, шчыры. Зміцер заняў пазіцыю «лепшая абарона — гэта напад»: актыўна аспрэчваў абвінавачванні пракурора, адкрыта гаварыў пра фальш і прафанацыю судовага працэсу.**

«Я прашу даць мне восем, дзесяць год, але каб я мог быць дома і рэалізоўваць свае творчыя планы», — гэты ўрывак з «апошняга слова» абвінавачанага Дразда на судзе ўжо стаў крылатым выразам сярод дэмакратычных актывістаў. Зміцеру Дразду далі тры гады, якія 38-гадовы мужчына ў самым росквіце сілаў мусіць правесці ў турме.

## Нашчадак уладальніка Драздоў

«Мы — простыя людзі», — некалькі разоў паўтарае маці Зміцера Дразда, Зоя Дзмітрыеўна, паказваючы сціплую двухпакаёўку ў адным са спальных раёнаў, дзе жыве яна, дачка з мужам і двума дзецьмі і Зміцер. «Зміцер сем год працаваў у Маскве, дзе сустрэў і пакахаў дзяўчыну, але яны пасварыліся. Тая дзяўчына, Воля, ведае пра ягоны арышт, дапамагае нам, хоча прыехаць пабачыць яго», — распавядае Зоя Дзмітрыеўна.

З Масквы Зміцер прыехаў два гады таму. За гэты час гісторык паспеў дапісаць кнігу, працу над якой распачаў яшчэ перад ад'ездам у Расію. 600-старонкавы даведнік «Землеўладальнікі Мінскай губерні 1861–1900» выйшаў у кастрычніку, за два месяцы да арышту. «Гэтыя два гады Дзіма хадзіў у архівы як на працу, — смяецца маці. — Ён ужо амаль падрыхтаваў да друку і другую кнігу, прысвечаную гісторыі фатаграфіі і лёсу фатографаў XX стагоддзя, але арышт парушыў ягоныя планы. Ён мне зараз піша: гатовы сядзець у турме колькі спатрэбіцца, абы архівы былі пад рукой».

Падчас гутаркі высвятляецца, што «простыя людзі» маюць шляхетныя карані. «Падчас даследавання архіваў Зміцер вызначыў генеалогію Драздоў ажно з 1600 года. Нашы продкі былі буйнымі землеўладальнікамі. Знакамітая вёска Дразды, якую зараз абжыло кіраўніцтва Беларусі, таксама належала нашым продкам. Я нарадзіла і Зміцера, і ягоную сястру яшчэ ў Драздах, гэта ўжо пазней мы перабраліся ў Мінск», — узгадвае Зоя Дзмітрыеўна.

Знойдзеныя звесткі пра продкаў-землеўладальнікаў і падштурхнулі гісторыка да стварэння даведніка. Ён, дарэчы, свабодна прадаецца ў кнігарнях сталіцы. Праўда, засталіся ўжо лічаныя асобнікі — пасля арышту






Зміцера ў інтэрнэце разгарнулася кампанія ў падтрымку гісторыка і яго сям'і, людзі пачалі актыўна набываць кнігі.

Пра перавыданне даведніка Зоя Дзмітрыеўна пакуль што не думае — фінансава накладная справа, але рыхтуе сыну іншы сюрпрыз: «Распачынаем рамонт у Дзіміным пакоі, каб выйшаў — і ўжо ўсё было гатовае. Праўда, не ведаю пакуль што, куды падзяваць усе гэтыя кнігі. У нас калі міліцыянты ператрус рабілі, дык здзівіліся, што так шмат кніг». Кнігі сапраўды паўсюль: і ў шафах, і на падлозе. Таўшчэзныя тамы энцыклапедый па гісторыі Беларусі, даведнікі па гісторыі суседскай Расіі, некалькі Біблій, англамоўная літаратура — усё гэтае багацце чакае зняволенага даследчыка.

## Па году за ўдар

У сям'і Дзімам ганарацца. «Ён у нас вучоны», — урачыста гаворыць сястра Зміцера, Наталля, кухар па адукацыі. «Вучоны» — гэта значыць, што Зміцер атрымаў вышэйшую адукацыю. Ён скончыў гістарычны факультэт БДУ, перад гэтым атрымаўшы і сярэднюю адукацыю ў Мінскім тэхналагічным тэхнікуме па спецыяльнасці «фотатэхніка».

«Дзіма захапляўся фатаграфіяй, здымаў у асноўным прыроду. У яго былі нават уласныя фотавыставы ў Мінску. Ён і на журфак пасля хацеў паступаць, але троху балаў не хапіла. Ён часта жартаваў — маўляў, дай мне волю, я б усё жыццё вучыўся», — распавядае Зоя Дзмітрыеўна. Зміцер сапраўды не губляе часу дарма і працягвае вучыцца за кратамі — удасканальвае англійскую і вывучае польскую мовы.

Жанчына адзначае, што яе паслухмяны, «хатні» сын — чалавек рызыкоўны і гатовы ўсё патраціць на свае захапленні. «Яму не важна, як ён харчуецца, што апранае. Ён быў шчаслівы, калі накапіў грошаў на дарагі прафесійны фотаздымач, які, дарэчы, яшчэ не вярнулі з КДБ. Ён траціў вялікія грошы на рарытэтныя фотаздымкі XIX — пачатку XX стагоддзяў. Дзіма спісваўся з калекцыянерамі праз інтэрнэт і выкупляў фота. Апошнія фотаздымкі прыйшлі ўжо пасля ягонага арышту — калі напісала яму ў лісце пра гэта, ён быў такі задаволены!» — Зоя Дрозд паказвае кардонную каробку з некалькімі дзясяткамі рарытэтных фатаграфій.

Па словах сястры Наталлі, Зміцер быў лёгкі на пад'ём: «Яму не складае праблемы сабрацца і паехаць, калі ён нешта вырашыў. Ён любіць вандраваць, аднойчы ўзяў ды паехаў з мінімальнай сумай грошай "дзікуном" у Егіпет. Столькі прыгодаў там напаткаў!.. Пасля нават напісаў для сваякоў невялікую кнігу пра сваю незвычайную вандроўку».

Пры слове «сваякі» Зоя і Наталля Дрозд хмурацца. Пасля арышту Зміцера сваякі перасталі з імі кантактаваць. Непрыемнасці ўзніклі і з суседкамі-пляткаркамі. «Затое мы атрымоўваем вельмі шмат добрых словаў падтрымкі ад абсалютна незнаёмых людзей, разнаёміліся са сваякамі іншых палітвязняў. Я раней была чалавекам па-за палітыкай, а зараз сайты незалежных СМІ — мае ўлюбёныя», — распавядае Наталля.

Жанчына выказвае меркаванне, што Зміцер увесь час знаходзіўся ў пошуку сфераў, дзе ён яшчэ мог бы сябе рэалізаваць, выявіць свой талент. Такой сфераю сталася палітыка: у 2010 годзе Зміцер увайшоў у ініцыятыўную групу Андрэя Саннікава, збіраў за яго подпісы. «Я яго так адгаворвала, але Дзіма — чалавек самастойны, рашэнне пра ўдзел у выбарчай кампаніі і вулічнай акцыі 19 снежня прыняў асэнсавана», — пацiскае плячыма маці. У ліку многіх іншых Зміцера Дразда абвінавацілі ва ўдзеле ў «масавых беспарадках» — з адчаю мужчына ўдарыў тры разы пластыкавым мегафонам па драўляных загароджах у дзвярах Дома ўраду. «Мы ледзь з розуму не сышлі, калі пачулі, што просяць пакараць яго дзесяццю гадамі турмы. Думалі, што атрымае напоўніцу за сваю дзёрзкасць. Але далі па году за ўдар», — сумуе Наталля.

У «апошнім слове» экс-кандыдат у прэзідэнты Андрэй Саннікаў узгадаў чатырох зняволеных, якія найбольш дапамагалі яму падчас выбарчай кампаніі: жонку Ірыну Халіп, сябра штабу Зміцера Бандарэнку, прэс-сакратара Аляксандра Атрошчанкава і «простага чалавека» гісторыка Зміцера Дразда.

КАЛОНКА КАНСТАНЦІНА СКУРАТОВІЧА

# КЛІЗМАТЭРАПІЯ



**Куды б гэтымі днямі ні ступіла нага шараговага беларуса, паўсюль ён чуе бясконцыя размовы пра інфляцыю, дэфляцыю ды іншыя звычайна не цікавыя рэчы. У грамадскім транспарце, ва ўстановах і на прадпрыемствах, у аграгарадках і сталіцы. Чорт ведае, што такое!**

Чорт не чорт, але эканамісты, мусіць, ведаюць. Яшчэ ўчора тыя з іх, хто атрымліваў заробкі з бюджэту, паблажліва распавядалі, чаму такога не можа быць. А сёння складна тлумачаць, чаму гэта здарылася. Іх апаненты таксама не чакалі, што інфляцыя накінецца на беларускі рубель з імпэтам старой дзеўкі-пакаёўкі, якая спакусіла гаспадарскага сына-студэнта. Трывала, трывала — і на табе...

А адзін мусіць ці не самы выбітны сучасны эканаміст тлумачыў, што пад пагрозай знаходзіцца не беларуская, а амерыканская грашовая адзінка. І вось на табе, вёска, трактар, распішыся за паравоз! У прыватным сектары пачаліся затрымкі з выплатай заробкаў, асобныя камерсанты нават спрабуюць спагнаць з персаналу грошы, якія выплацілі напярэдадні выбараў. Калі іх моцна падціснулі адміністратары-ідэолагі, патрабуючы заплаціць кожнаму не менш за 500 долараў.

Што ж робіцца на адзінай у гэтым шалёным свеце выспе стабільнасці, памяркоўнасці і талерантнасці! Пакаціліся калёсы з гары, конік не трывае, лейцы рве з рук небаракі-фурмана. На якога ўсе разлічвалі, бо лічылі першым пасля Пана Бога на зямлі конюхам.

Сацыёлагі даводзяць: згодна з апытаннямі, беларусы пачалі замяняць у сваім рацыёне звыклыя прадукты больш таннымі аналагамі. Так робіць абсалютная бальшыня. Па дадзеных ААТ «Люстэрка-Інфо», якое ачольваецца спадаром Міхейчыкавым, так робяць 76% беларусаў.

Але ж справа ў тым, што на рынку хутчэй за ўсё даражэюць тавары, попыт на якія падвышаецца. Тая ж бульба, якая ніколі не была далікатэсам, па дадзеных Белстата, за чатыры месяцы падаражэла на 35%, гародніна — на 32%, садавіна — на 29%, крупы — на 27%, цукар — на 20%, гарбата — на 18%. Тавары мяса-малочнай групы, калі верыць афіцыйным дадзеным, як мінімум, не адстаюць ад агульнага тэмпу росту. Але тут такая акалічнасць — так званыя далікатэсныя прадукты (вяндліна, выразка, сыравяленыя кілбасы ды іншы шляхецкі асартымент) ужо дасягнулі нейкага ўзроўню раўнавагі, і таму здольныя задавальняць збольшага эстэтычны попыт спажыўцоў. Купляць іх не купляюць. А тое, без чаго абысціся нельга (супавыя наборы, розная драбяза, як раней казалі, кілбасныя абрэзкі) па сваіх коштах набліжаюцца да больш якасных, а тыя цягнуцца да ўчорашняй цаны далікатэсаў.

Калі прывесці гэты расклад цалкам, то добра бачна, што інфляцыя грызе перш-наперш абавязковы набор са спажывецкага кошыка. Так званыя тавары першай неабходнасці, або сацыяльна важкія, пра якія быццам бы павінен клапаціцца ўрад. Нават калі ён адпускае кошты на іх, то бяднейшых трэба забяспечваць грашовымі або натуральнымі льготамі. Як гэта адбывалася напачатку 1990-х, калі пра беларускі эканамічны цуд толькі марылі, а ў стабільны рост, мусіць, верыў толькі адзін усім вядомы палітык ды эканаміст.

Але ж здарылася. І зараз трэба пачынаць усё з пачатку. Гэта значыць, выключыць станок, на якім друкуюць беларускія грошы, ды зацягнуць папругі ў беднякоў так, каб жывот прыліп да хрыбетніка.

Пасля гэтага, калі эканоміка не здохне (нават калі здохне), настане час прымацца за лекаванне. Памятаеце, як нашы рагаталі ды казалі, што шокавай тэрапіі, як у Польшчы, у Беларусі не будзе. Гэта чыстая праўда, тэрапіі не было, а шоку хапала. Часцяком так давалі па вушах, што звон стаяў.

То шапікі з вуліцы папрымаюць, то забароняць прадпрымальнікам наймаць працоўную сілу, то яшчэ што, то чорта лысага, то ўвядуць у абменніках рэжым паўабмену. Гэта калі валюту купляюць, а беларускіх рублёў не даюць. А самі стаяць за вуглом, каб злавіць на «незаконнай валютнай аперацыі» ды абабраць як ліпку. Усё ім аддай — долары, марачкі, грыўні, рублі, рухомае ды нерухомае.

А як жа — забеспячэнні стабільнасці фінансавага абарачэння ёсць пытаннем нацыянальнай бяспекі.

Каб вам, смешныя і шчырыя вы людзі, Бог столькі здароўя даў, колькі ў нас тых долараў у кішэні. І суду б не патрэбна было.

Пішуць і кажуць, што Беларусь пад іх кіраваннем сталася самай арыгінальнай у свеце дзяржавай. Але гэта не так. Яны ж толькі пішуць, а не чытаюць. Дарэмна. Бо менавіта такое ноў-хаў даўно апісаў Яраслаў Гашак. Памятаеце, як Швейка з іншымі ваякамі ў турэмным лазарэце наведалі дамы з дабрачыннымі прысмакамі. «Салдацікі» ўсё хуценька з'елі. Нават косткі абсмакталі так, што яны сталі падобнымі на косткі, што некалькі гадоў праляжалі ў гняздзе арла пад спякотным сонцам. Але жанчыны сышлі, а начальства засталося. І загадала кожнаму байцу ўставіць клізму ў... А пасля загарнуць кожнага ў мокрую прасціну. Каб служба мёдам не здавалася.

Як вось у нас зараз з намі. Наеліся ад пуза, а пераварыць не паспелі. А трэба паспяваць.

КРЫЗІС

# ВАЛЮТНАЕ ПОЛЫМЯ ШУГАЕ ПА ПРАСТОРАХ

Вольга ХВОІН

**Курс долара 18 мая на пазабіржавым рынку дасягнуў адзнакі ў 7 500 рублёў за долар. Па такім курсе банкі гатовыя купляць валюту на рынку, не выстаўляючы пры гэтым каціроўку продажу. На чорным наяўным рынку долары можна было прадаць у дыяпазоне 6300–7500 рублёў. Назіраецца шакуючы рост цэн і накапленне праблем у эканоміцы, якія пакуль што не вырашаюцца.**




Аляксандр Лукашэнка (відаць, спрабуючы заспакоіць панічныя настроі ў грамадстве) заявіў, што Масква прадставіць Беларусі крэдытную падтрымку на суму 6 мільярдаў долараў. Аднак раней віцэ-прэм'ер, міністр фінансаў РФ Аляксей Кудрын заяўляў, што Расія не плануе прадстаўляць Беларусі крэдыт з уласных сродкаў. «Мы разглядаем толькі крэдыт ЕўрАзЭС», — сказаў Кудрын. Міністр фінансаў Расіі паведаміў, што перамовы па выдачы Беларусі крэдыту ў суме 3 мільярдаў долараў з фонду ЕўрАзЭС (па 1 мільярду ў 2011–2013 гадах) будуць завершаныя ў бліжэйшыя дні. Па яго словах, Мінск мае намер выставіць у гэтым годзе на продаж шэраг прадпрыемстваў, якія ацэнены ў 3 мільярда долараў. «Будзе прыватызаваны шэраг актываў для падтрымання аплатнага балансу. Беларускі бок сам будзе вызначаць, якія гэта актывы і ў якія тэрміны. Зыходзячы з патрэб гэтага года, гэта прыкладна каля 3 мільярдаў долараў. Гэта сума, якая мусіць быць атрымана ад прыватызацыі ў гэтым годзе», — сказаў Кудрын.

Да таго ж, па інфармацыі расійскага «Камерсанта», Расія разглядае магчымасць набыцця кантрольнага пакета акцый «Белтрансгаза» пры аказанні фінансавай дапамогі Беларусі. Яшчэ на пачатку красавіка Беларусь заявіла аб магчымасці продажу сваёй часткі 50-працэнтнай дзярждолі ў ААТ «Белтрансгаз». Цягам 2007–2010 гадоў «Газпром» выкупіў 50% акцый ААТ «Белтрансгаза» за 2,5 мільярда долараў. Здзелка была здзейсненая зыходзячы з праведзенай у канцы 2006 года банкам «ABN Amro» ацэнкі рынкавага кошту актываў «Белтрансгаза» ў суме 5 мільярдаў долараў. Прагнозы па здачы дзяржаўнай уласнасці паступова рэалізуюцца на практыцы.

Аналітыкі інфармацыйнага агенцтва «РИА-Новости» мяркуюць, што неафіцыйны курс ужо выраўняў умовы знешняга гандлю, таму яго далейшае зніжэнне абумоўлена ў першую чаргу дэвальвацыйнымі і інфляцыйнымі чаканнямі. Каб спыніць дэвальвацыю, неабходна спачатку прызнаць факт дэвальвацыі і ўсталяваць адзіны курс. Акрамя таго, Цэнтральнаму банку Беларусі неабходна вярнуцца на валютны рынак. Гэтыя ўмовы, на думку экспертаў «РИА-Новости», неабходныя, але недастатковыя. Нават пры больш высокім афіцыйным курсе попыт на валюту ў кароткатэрміновай перспектыве будзе вельмі вялікім, таму для задавальнення ўсіх жадаючых атрымаць замежную валюту НБРБ можа спатрэбіцца каля 10 мільярдаў долараў.

Нават у выпадку атрымання ў бліжэйшы час крэдытаў ад Расіі і ЕўрАзЭС у 5–6 мільярдаў долараў, у беларускага Нацбанку патрэбнай сумы з улікам уласных золатавалютных рэзерваў для жорсткага спынення дэвальвацыі не будзе. У гэтым выпадку дэвальвацыя зможа спыніцца, толькі калі гандлёвы баланс краіны стане станоўчым.

> Нават у выпадку атрымання ў бліжэйшы час крэдытаў ад Расіі і ЕўрАзЭС у 5–6 мільярдаў долараў, у беларускага Нацбанку патрэбнай сумы з улікам уласных золатавалютных рэзерваў для жорсткага спынення дэвальвацыі не будзе

Былы кіраўнік Нацбанку Станіслаў Багданкевіч карані праблемы на валютна-фінансавым рынку бачыць у выбудаванай сістэме. Паводле яго слоў, цягам апошніх гадоў банкаўская сістэма Беларусі развівалася бурна, і мае пэўныя дасягненні. «Але яна ж з'яўляецца галоўным віноўнікам, калі адкінуць кіраўніцтва краіны, абвастрэння грашова-валютнага крызісу. Чатыры буйныя банкі — Белаграпрамбанк, Беларусбанк, Парытэтбанк, Белінвестбанк — кантралююцца дзяржавай, гэта 65–66% ад агульнага капіталу. 20% кантралюе Расія, 13% — іншыя дзяржавы. І толькі 2% капіталу кантралююцца прыватнымі ўласнікамі. Рэсурсная база банкаў — 127 трыльёнаў рублёў, але ў гэтай рублёвай базе доля друкарскага станка Нацбанку — 40%. Нацбанк даў рэсурс камерцыйным банкам правесці пасяўную, уборачную кампанію. На 1 студзеня 2010 года пазыкі камерцыйных банкаў Нацбанку складалі 8 трыльёнаў, а на 1 студзеня 2011 года — 28 трыльёнаў рублёў. Узнік дысбаланс у рублёвай, валютнай, таварнай масе на рынку», — рэзюмуе Багданкевіч.

Разам з тым прафесар Багданкевіч заклікае не шукаць крайняга толькі ў Нацбанку. «Эмісійны банк Беларусі абвінавачваць нельга, бо асноўныя кірункі грашова-крэдытнай палітыкі зацвердзіў кіраўнік дзяржавы. Таму, калі з'явілася такая праблема, ніхто не хацеў браць на сябе адказнасць, каб не парушыць зацверджаныя паказчыкі. Таму я заўжды пераконваю, што эмісійны банк мусіць мець аўтаномію, бо ўлады мяняюцца, а эканоміцы трэба стабільнасць», — гаворыць былы старшыня Нацбанку Беларусі.

«Больш за ўсё здзіўляе, чаму ўлады дагэтуль не спрабуюць вырашаць рэальныя праблемы. Давялі да поўнай ручкі — сёння хаос на спажывецкім рынку, па ўсіх накірунках галапіруючы рост цэн. Мы хвалімся, што ў нас укладзеныя аграмадныя рэсурсы ў сельскую гаспадарку. Але якую бульбу мы набываем? З Афрыкі! І гэтак далей. У нас крайне не развіты ўнутраны рынак, якія базуецца на ўласных рэсурсах. Пасля сыходу ад Савецкага Саюза наша эліта паставіла галоўную задачу — захаваць структуру дзяржуласнасці. І мы хвалімся, што захавалася буйная дзяржуласнасць. А што для народа — гэта добра ці кепска? Палякі разбурылі — і маюць заробак у 1 300 долараў. Мы не разбурылі — і мелі віртуальныя 500 долараў, а цяпер 300. Дык можа варта было разбурыць?» — заўважае экс-старшыня Нацбанку Багданкевіч.

Прадстаўнікі апазіцыі, прадпрымальніцкіх структур ужо які раз рыхтуюць праект прапаноў ураду. На гэты раз прадстаўлены праект антыкрызіснай праграмы (для прапаноў ён не закрыты), у якім найперш прапануецца Нацбанку неадкладна правесці рынкавую дэвальвацыю рубля і аднавіць адзіны курс валюты. А таксама накіраваць запыт у Міжнародны валютны фонд аб прадстаўленні стабілізацыйнага крэдыту для падтрымкі нацыянальнай валюты.

У шэрагу прапаноў, якія даўно наспелі ў беларускай гаспадарцы, і рэфармаванне прадпрымальніцкай сферы, і стымуляцыя прыватнай ініцыятывы. Як зазначыў старшыня сталічнага Саюза прадпрымальнікаў і працадаўцаў Уладзімір Карагін, у сувязі з калапсам на валютным рынку многія прадпрымальнікі вымушаныя скарачаць ці згарнуць сваю дзейнасць. Таму неабходна тэрмінова распрацаваць праграму падтрымкі, якая дазволіла б спрасціць працу ў цяперашніх умовах «барацьбы за выжыванне» і захавала б працоўныя месцы.

ТУРЫЗМ

# У АДПАЧЫНАК НА БУЛЬБУ

Вольга ХВОІН

**Валютны крызіс закрануў бадай што ўсе сферы гаспадаркі. Не засталіся ў баку ад праблем і прадстаўнікі рэкрэацыйных, забаўляльных структур, якія падвышаюць кошты на свае паслугі адпаведна росту валютнага курса.**

Туры на чэрвень у той ці іншай ступені былі раскупленыя яшчэ ў сакавіку-красавіку, калі дзейнічала ранняе браніраванне, а праблемы з валютай не мелі такіх маштабаў. Цяпер жа турфірмы затаіліся ў чаканні: пакуль не зразумела, што прынясе сезон адпачынкаў. «Продажы ўпалі ў параўнанні з любым месяцам мінулага года. Карыстаюцца попытам бліжнія туры, на якія не трэба віза, — экскурсіі ў Кіеў, Львоў, — расказвае ўласніца невялікай турыстычнай фірмы Юлія. — Авіятуры цяпер менш папулярныя. Грошы ў людзей ёсць, але, думаю, тут варыянт «не да жыру, быць бы жывым». Людзі цяпер проста не ведаюць, што будзе заўтра, ці будуць яны мець працу. Непрадказальнасць будучыні моцна ўплывае на жаданні расставацца з грашовымі запасамі».

Звычайна беларусы пачынаюць адкладаць грошы на адпачынак яшчэ з зімы. Аднак на фоне імклівага падвышэння коштаў на спажывецкія тавары многія адмаўляюцца ад пляжнага варыянту адпачынку і скіроўваюцца ў бок лецішчаў і дамкоў на вёсках. Невялікае апытанне сярод знаёмых паказала: колькасць тых, хто плануе летам палоць грады, перавышае колькасць лайдакоў-курортнікаў. У такім кантэксце спецыялісты прадказваюць скарачэнне турыстычных заявак напалову і больш.

Цяпер кліенты часцей звяртаюцца да бюджэтных прапаноў, але запоўніць забраніраваныя месцы на ўзроўні мінулага года наўрад ці атрымаецца. Таму турфірмы, якія яшчэ напрыканцы мінулага года арганізавалі чартарныя рэйсы, таропка спрабуюць скараціць праграмы.

Турыстычныя кампаніі атрымалі дазвол разлічваць кошт тураў у замежнай валюце, пры гэтым прытрымлівацца курсу валюты па дамоўленасці з кліентам. «Курс мяняецца амаль штодня. На 18 мая долар лічылі па 6 000 рублёў, 19-га будзе 6 500, хоць 17-га курс быў 5500, 16-га — 5 000, — тлумачыць прадстаўніца турфірмы. — Нешта прагназаваць складана, бо мы не ведаем, па якім законе будзем жыць заўтра. Нейкі працэнт беларусаў у любым выпадку будзе ездзіць адпачываць. У нас фірма не мае вузкай спецыялізацыі, мы прадаём і пуцёўкі, і экскурсійныя туры. Таму хоць неяк трымаем узровень продажаў».

Што тычыцца адпачынку беларусаў унутры родных межаў, то пуцёўкі ў санаторыі і дамы адпачынку даўно раскупленыя. У асноўным кліентамі беларускіх здраўніц з'яўляюцца расіяне. Кошты ж на дзіцячы адпачынак, як і на дарослы, цягам апошняга месяца павысіліся на 10–20% па «аб'ектыўных прычынах», як тлумачыць кіраўніцтва аздараўляльных устаноў.

7

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ TV

## 23 МАЯ, ПАНЯДЗЕЛАК

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 00.00** Навіны.
**06.05, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.05** Зона Х. Дарожныя навіны.
**07.30, 08.25, 11.50** «Дзелавое жыццё».
**08.30** У свеце матораў.
**09.10** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
**10.10** «Мымра». Камедыя (Расія).
**11.40** «Маляваны рай». Дак. фільм.
**12.10** «Прышэльцы». Фантастычная камедыя (Францыя).
**14.15** «OFF STAGE LIFE».
**14.30** Nota Bene.
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.35** «Выпадковыя сувязі» . Забаўляльна-гумарыстычная праграма.
**16.25** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**17.25** Серыял «Маруся. Вяртанне».
**18.25** «Акно ў Еўропу».
**18.50, 01.35** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** «Арэна». Праграма аб спорце.
**19.55** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** «Панарама».
**21.45** «Камандзіроўка».
**22.00** «Адгадай, хто?». Камедыя (ЗША).
**00.10** «Доктар Хаўс-4». Серыял (ЗША).
**01.05** Інфармацыйна-забаўляльная праграма «Праверка чутак».
**01.40** Дзень спорту.

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** Контуры.
**10.10** «Смак».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Аматарка прыватнага вышуку Даша Васільева». Шматсерыйны фільм.
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** Тэлечасопіс «Саюз».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Зваротны адлік».
**18.55** «Чакай мяне».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Ток-шоў «Адчынены фармат».
**22.10** Фільм «Чыкага».
**00.15** «Крэм». Шматсерыйны фільм.
**01.10** Начныя навіны.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Тыдзень».
**09.35** «Вялікі сняданак».
**10.05** «Пяць гісторый».
**10.40** «Нашы суседзі». Серыял.
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Фантастыка пад грыфам «Сакрэтна».
**13.50** «Зорны рынг».
**15.00** Канцэрт М.Задорнава.
**16.00** СТБ прадстаўляе: «КультУРА!».
**16.50** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**17.10** «Наша справа».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.35** Фільм «Спякота». Расія, 2006 г.
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Сталічны футбол».
**23.30** Фільм «Ватэль». Францыя-Вялікабрытанія-Бельгія, 2000 г.

**06.35** Маладзевы серыял «Універ» (Расія).
**07.00** «ЛАДная раніца».
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Серыял «Ты маё жыццё».
**09.10** Фантастычны баявік «Вайна сусветаў».
**11.15** Пра мастацтва.
**11.40** Школа рамонту.
**12.35** «Гадзіна суду. Справы сямейныя».
**13.40** Дэтэктыўная меладрама «Лясун» (Расія). 1-я серыя.
**14.50** Конкурс-вiктарына «Дзеці новага пакалення».
**15.50** Мультсерыял «Сямейка піратаў».
**16.15** Пазакласная гадзіна.
**16.35** «Кулінарыя для дзяцей». Мультфільм.
**16.50** «Навіны надвор'я».
**17.20** Дакументальна-гістарычны серыял «Мяжа. Полацкае княства». 1-я серыя.
**18.00** Серыял «Ты маё жыццё».
**19.05** «Халі-галі». Скетч-шоў.
**19.30** Серыял «Дзяржаўная мяжа».
**21.00** Калыханка.
**21.15** Тэлебарометр.
**21.20** КЕНО.
**21.25** Беларуская часіна.
**22.30** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**23.10** Маладзевы серыял «Універ» (Расія).
**23.45** Авертайм.
**00.15** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. Агляд тура.

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.00** «Карціна свету».
**09.55** Надвор'е на тыдзень.
**10.00** «Пакой смеху».
**10.25** «Ранішняя пошта».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**12.20** «Кулагін і партнёры».
**12.50** «Забаронены канцэрт. Немузычная гісторыя». Дакументальны фільм.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.45** Тэлесерыял «Пяць хвілін да метро».
**18.50** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.30** Тэлесерыял «Дастаеўскі».
**22.40** Тэлесерыял «Брыгада».
**23.45** «Нічога асабістага». Інфармацыйна-сатырычная праграма.
**00.05** Навіны - Беларусь.
**00.15** «Весткі.ru».
**00.35** «Кінавойны па-савецку». Дак. фільм.

### НТВ

**06.05** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «Праграма Максімум».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.15** Сёння.
**10.20** «Кулінарны паядынак».
**11.20** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**12.05** «Да суду».
**13.25** «Пракурорская праверка».
**14.25** «Давайце мірыцца!».
**15.15** «Справа густу».
**15.40** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.30** Серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Масква. Цэнтральная акруга».
**23.40** «Сумленны панядзелак».
**00.30** «Школа зласлоўя».

### EUROSPORT

**09.30** Матаспорт. Часопіс.
**09.45** Веласпорт. Джыро д'Італія. 15-ы этап.
**10.30** Тэніс. Адкрыты чэмпіянат Францыі. Дзень 1-ы.
**11.30** Тэніс. Адкрыты чэмпіянат Францыі. Дзень 2-і.
**21.30, 02.00** Тэніс. Гейм. Сэт. Матс.
**22.05** Пра рэстлінг. Агляд WWE.
**22.40** Пра рэстлінг. Vintage Collection. ЗША.
**23.45** Футбол. Еўрагалы.
**00.15** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Часопіс.
**01.00** Веласпорт. Джыро д'Італія. 15-ы этап.
**01.45** Вось дык так!!!.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**07.30** Фільматэка майстроў: «Ясмін», маст. фільм, 2006 г., Польшча.
**09.20** Дакументальная гадзіна: «CIA: таемныя войны», 2008 г., Францыя: фільм 3, «Вайна спараджае вайну (1990–2001)».
**10.10** ПраСвет.
**10.35** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**10.50** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**11.00** МакраФон: «Рок-карона–2010»: ч. 2.
**11.30** Эксперт.
**12.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**12.05** Фільматэка майстроў: «Ясмін», маст. фільм, 2006 г., Польшча.
**13.50** Дакументальная гадзіна: «CIA: таемныя войны», 2008 г., Францыя: фільм 3, «Вайна спараджае вайну (1990–2001)».
**14.45** ПраСвет.
**15.10** Басаног па свеце.
**15.35** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**15.50** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**16.00** МакраФон: «Рок-карона–2010»: ч. 2.
**16.30** Эксперт.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Эміль з Лёнэбэр'і», серыял: 12 серыя.
**17.30** «Час гонару», серыял: 30 серыя.
**18.15** Хто ёсць кім?: «Праваслаўныя дзеячы», дак. фільм, 2008 г., Польшча.
**18.35** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**18.50** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**19.00** «Тры кіламетры да неба», рэпартаж, 2010 г., Беларусь.
**19.20** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.35** Гарачы каментар.
**19.45** Калыханка для самых маленькіх.
**19.55** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.25** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Пікасо ў Варшаве, або Як пачалося шаленства сацрэалізму», дак. фільм, 1992 г., Польшча.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Прыватная калекцыя (агляд культурных падзеяў).
**21.55** Фільматэка майстроў: «Ясмін», маст. фільм, 2006 г., Польшча.
**23.40** Аб'ектыў.
**00.05** Гарачы каментар.

## 24 МАЯ, АЎТОРАК

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 00.05** Навіны.
**06.05, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.05** Зона Х. Дарожныя навіны.
**07.30, 08.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** «Арэна». Праграма аб спорце.
**09.10** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.05** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**10.50** Серыял «Маруся. Вяртанне».
**11.40** «Камандзіроўка».
**12.10** «Адчайныя хатнія гаспадыні-5». Камедыйны серыял (ЗША). 1-я і 2-я серыі.
**13.45** Патрабуецца.
**14.05** «Здароўе».
**14.30** «Культурныя людзі». Інфармацыйна-забаўляльная праграма.
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.40** «Зброя». Цыкл дак. фільмаў.
**15.50** Серыял «Дыхай са мной» (Расія).
**16.50** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**17.45** Серыял «Маруся. Вяртанне».
**18.50, 01.10** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** «Сфера інтарэсаў».
**19.55** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** «Панарама». Інфармацыйны канал.
**21.45** Футбол. Ліга чэмпіёнаў. Відэачасопіс.
**22.15** «Мы тут больш не жывем». Рамантычная драма (ЗША).
**00.15** «Доктар Хаўс-4». Серыял (ЗША).
**01.15** Дзень спорту.

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здарова!».
**10.20** «Смак».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Аматарка прыватнага вышуку Даша Васільева». Шматсерыйны фільм.
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Фільм «Выходжу цябе шукаць».
**22.15** Фільм «Пасля прачытання спаліць».
**00.00** «Несакрэтныя матэрыялы».
**00.30** «Крэм». Шматсерыйны фільм.
**01.25** Начныя навіны.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Гаворыць і паказвае Мінск».
**09.00** Фільм «Спякота». Расія, 2006 г.
**10.40** «Нашы суседзі». Серыял.
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** «Фірмовая гісторыя». Серыял.
**14.40** «Рэдакцыя». Серыял. Закл. серыі.
**15.35** «Ваенная таямніца».
**16.50** «Сталічны футбол».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Прэм'ера! «Даішнікі 2». Серыял.
**21.30** «Сапраўдная гісторыя».
**22.05** «Аўтапанарама».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Забойная сіла». Серыял.
**00.00** «Меч». Серыял.

**06.35** Маладзевы серыял «Універ» (Расія).
**07.00** «ЛАДная раніца».
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**08.40** Серыял «Ты маё жыццё».
**09.45** Серыял «Дзяржаўная мяжа».
**11.15** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. Агляд тура.
**12.05** Авертайм.
**12.40** «Страсці па культуры».
**13.25** «Гадзіна суду. Справы сямейныя».
**14.30** Дэтэктыўная меладрама «Лясун» (Расія). 2-я серыя.
**15.45** Конкурс-вiктарына «Дзеці новага пакалення».
**16.55** Пазакласная гадзіна.
**17.15** «Кулінарыя для дзяцей». Мультфільм.
**17.20** Дак.-гістарычны серыял «Мяжа. Вялікае княства Літоўскае». 2-я серыя.
**18.00** Серыял «Ты маё жыццё».
**19.05** «Халі-галі». Скетч-шоў.
**19.35** Серыял «Дзяржаўная мяжа».
**21.00** Калыханка.
**21.15** Тэлебарометр.
**21.20** КЕНО.
**21.25** Беларуская часіна.
**22.30** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**23.10** Маладзевы серыял «Універ» (Расія).
**23.50** «Спорт-кадр».

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.15** «Прамы эфір».
**10.10** «Галоўная таямніца. Рэспубліка ШКІД». Дакументальны фільм.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Нічога асабістага». Інфармацыйна-сатырычная праграма.
**11.50** Тэлесерыял «Дастаеўскі».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.45** Тэлесерыял «Пяць хвілін да метро».
**18.50** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.30** Тэлесерыял «Дастаеўскі».
**22.40** Тэлесерыял «Брыгада».
**23.45** Навіны - Беларусь.
**23.55** «Весткі.ru».
**00.15** Прэм'ера. «Сведкі».

### НТВ

**06.05** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «Руская сенсацыя».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.15** Сёння.
**10.25** «Кватэрнае пытанне».
**11.25** «Увага: вышук!».
**12.05** «Да суду».
**13.25** «Пракурорская праверка».
**14.25** «Давайце мірыцца!».
**15.15** «Справа густу».
**15.40** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.30** Серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Масква. Цэнтральная акруга».
**23.40** «Вочная стаўка».

### EUROSPORT

**09.30** Футбол. Еўрагалы.
**10.00** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Часопіс.
**10.45** Тэніс. Адкрыты чэмпіянат Францыі. Дзень 2-і.
**11.30** Тэніс. Гейм. Сэт. Матс.
**12.00** Тэніс. Адкрыты чэмпіянат Францыі. Дзень 3-і.
**15.30** Веласпорт. Джыро д'Італія. 16-ы этап.
**18.30** Тэніс. Адкрыты чэмпіянат Францыі. Дзень 3-і.
**21.30** Тэніс. Гейм. Сэт. Матс.
**21.45** Футбол. Кубак чатырох нацый. Уэлс - Шатландыя.
**23.45** Веласпорт. Джыро д'Італія. 16-ы этап.
**00.45** Аўтагонкі. Паршэ. Барселона (Іспанія).
**01.15** Матаспорт. Альбасэтэ (Іспанія).
**02.15** Тэніс. Гейм. Сэт. Матс.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** Гарачы каментар.
**07.30** «Народжаныя для прытонаў», дак. фільм, 2004 г., ЗША.
**08.55** «Час гонару», серыял: 30 серыя.
**09.40** «Эміль з Лёнэбэр'і», серыял: 12 серыя.
**10.05** Еўропа сёння.
**10.35** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Пікасо ў Варшаве, або Як пачалося шаленства сацрэалізму», дак. фільм, 1992 г., Польшча.
**11.05** «Тры кіламетры да неба», рэпартаж, 2010 г., Беларусь.
**11.25** Прыватная калекцыя.
**12.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**12.05** «Народжаныя для прытонаў», дак. фільм, 2004 г., ЗША.
**13.25** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**14.10** «Эміль з Лёнэбэр'і», серыял: 12 серыя.
**14.35** Еўропа сёння.
**15.00** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Пікасо ў Варшаве, або Як пачалося шаленства сацрэалізму», дак. фільм, 1992 г., Польшча.
**15.35** «Тры кіламетры да неба», рэпартаж, 2010 г., Беларусь.
**15.55** Прыватная калекцыя.
**16.25** Хто ёсць кім?: «Праваслаўныя дзеячы», дак. фільм, 2008 г., Польшча.
**16.40** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**16.50** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Эміль з Лёнэбэр'і», серыял: 13 серыя.
**17.30** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял: 38 серыя.
**18.30** Рэпартэр.
**19.00** Два на два (тэледыскусія).
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.35** Гарачы каментар.
**19.45** Калыханка для самых маленькіх.
**19.55** Праект «Будучыня».
**20.25** Навігатар (інфармацыйна-публіцыстычны тэлечасопіс).
**20.40** «Над Нёмнам» (тэлечасопіс).
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Асабісты капітал (эканамічная праграма).
**21.40** ПраСвет (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**22.05** «Каханне, здрада, жарсць», серыял: 7 серыя.
**22.50** Басаног па свеце (спазнаваўчая праграма).
**23.15** Аб'ектыў.
**23.40** Гарачы каментар.

## 27 МАЯ, ПЯТНІЦА

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 00.20** Навіны.
**06.05, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.05** Зона Х. Дарожныя навіны.
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Сфера інтэрасаў.
**09.10** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.10** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**11.00** Меладраматычны серыял «Маруся. Вяртанне» (Украіна).
**12.10** «Адчайныя хатнія гаспадыні-5». Камедыйны серыял (ЗША). 7-я і 8-я серыя.
**13.45** Патрабуецца.
**14.05** Відэафільм АТН «Высокія ноты Ляхавіцкай шляхты» цыклу «Зямля беларуская».
**14.15** «Клуб рэдактараў».
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.35** OFF STAGE LIFE.
**15.50** Меладраматычны серыял «Дыхай са мной» (Расія).
**16.50** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
**17.55** Меладраматычны серыял «Маруся. Вяртанне» (Украіна).
**19.30** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**19.55** Камедыйная меладрама «Маргоша» (Расія).
**21.00** Панарама.
**21.45** «Шлях Карліта». Крымінальная драма (ЗША).
**00.30** Інфармацыйна-забаўляльная праграма «Праверка чутак».
**01.00** Дзень спорту.

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здарова!».
**10.20** «Смак».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Аматарка прыватнага вышуку Даша Васільева». Шматсерыйны фільм.
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Чакай мяне». Беларусь.
**18.55** «Поле цудаў».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Што? Дзе? Калі? у Беларусі». Летняя серыя гульняў.
**22.30** «Наша Белараша».
**23.05** АНТ прадстаўляе: «Зоркі дыскатэк 90-х».
**00.50** Фільм «Марадона».
**02.30** Начныя навіны.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Мінштчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Даішнікі 2». Серыял.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Нашы суседзі». Серыял.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.45** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** «Фірмовая гісторыя». Серыял.
**14.40** «Next». Серыял.
**15.30** «Забойная сіла». Серыял.
**16.50** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**17.20** «Мінштчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** Ток-шоў «Лёс».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.20** «Добры вечар, маляня».
**20.35** Фільм «Уцёкі». Францыя, 1978 г.
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Гарачы лёд».
**23.30** «Відзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**00.15** Фільм «Ахопленыя полымем». ЗША, 1987 г.

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**08.40** Меладраматычны серыял «Ты маё жыццё» (Аргентына).
**09.40** Серыял «Дзяржаўная мяжа».
**11.05** Час футболу.
**11.35** Кінаспробы.
**11.55** Жывы гук.
**12.35** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**13.40** Гаспадар.
**14.10** Канцэрт.
**15.45** Лірычная кінааповесць «Шэльма» («Беларусьфільм»).
**17.05** Пазакласная гадзіна.
**17.25** «Кулінарыя для дзяцей». Мультфільм.
**17.30** Усё аб бяспецы.
**18.00** Серыял «Ты маё жыццё».
**19.05** «Халі-галі». Скетч-шоў.
**19.35** Серыял «Дзяржаўная мяжа».
**21.00** Калыханка.
**21.15** Тэлебарометр.
**21.20** КЕНО.
**21.25** «Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**22.20** «Пра мастацтва».
**22.50** Гімнастыка мастацкая. Чэмпіянат Еўропы. Дзень 1-ы.
**00.50** Дыялогі аб рыбалцы.

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.15** «Прамы эфір».
**10.10** «Мой срэбны шар».
**11.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «Дастаеўскі».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.45** Тэлесерыял «Пяць хвілін да метро».
**18.50** «Ефрасіння». Тэлесерыял. Расія, 2010 г.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.00** Весткі.
**20.30** Прэм'ера. «Ізмайлаўскі парк». Вялікі гумарыстычны канцэрт.
**22.25** Тэлесерыял «Брыгада».
**23.30** Навіны - Беларусь.
**23.40** Фільм «Мой пяшчотна каханы дэтэктыў».

### НТВ

**06.05** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «Вочная стаўка».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00** Сёння.
**10.20** «І зноў добры дзень!».
**11.15** «Развод па-руску».
**12.05** «Да суду».
**13.00** Сёння.
**13.35** «Суд прысяжных: галоўная справа».
**15.05** «Прафесія-рэпарцёр».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** «Следства вялі…».
**20.35** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**21.00** Прэм'ера. «Юры Айзеншпіс. Чалавек, які запальваў зоркі».
**22.45** «Нтвшнікі».
**23.55** Крымінальная драма «Крутыя часы».

### EUROSPORT

**09.30** Веласпорт. Джыро д'Італія. 18-ы этап.
**10.30** Тэніс. Адкрыты чэмпіянат Францыі. Дзень 5-ы.
**11.30** Тэніс. Гейм. Сэт. Матс.
**12.00** Тэніс. Адкрыты чэмпіянат Францыі. Дзень 6-ы.
**15.30** Веласпорт. Джыро д'Італія. 19-ы этап.
**18.30** Тэніс. Адкрыты чэмпіянат Францыі. Дзень 6-ы.
**21.00** Тэніс. Гейм. Сэт. Матс.
**21.45** Футбол. Кубак чатырох нацый. Уэлс - Паўночная Ірландыя.
**23.45** Конны спорт. Часопіс.
**00.15** Самыя моцныя людзі планеты.
**01.15** Тэніс. Адкрыты чэмпіянат Францыі. Дзень 6-ы.
**02.15** Тэніс. Гейм. Сэт. Матс.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** Гарачы каментар (публіцыстычная праграма).
**07.30** «Ціша пасля стрэлу», драма, 2000 г., Германія–Францыя.
**09.10** «Пўаро Агаты Крысці», дэтэктыўны серыял: 7 серыя.
**10.00** Праект «Будучыня» (навукова-папулярны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**10.30** «Школа на санцапёку», серыял: 25 серыя.
**11.00** Рэпартэр (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**11.25** Невядомая Беларусь: «Першая катастрофа», дак. фільм, 2009 г., Польшча.
**12.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**12.05** «Ціша пасля стрэлу», драма, 2000 г., Германія–Францыя.
**13.40** Праект «Будучыня» (навукова-папулярны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**14.10** «Школа на санцапёку», серыял: 25 серыя.
**14.40** Невядомая Беларусь: «Першая катастрофа», дак. фільм, 2009 г., Польшча.
**15.10** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**15.20** «Адэса... Адэса!», дак. фільм, 2004 г., Ізраіль–Францыя.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Таямніца Сагалі», серыял: 13 серыя.
**17.30** «Пўаро Агаты Крысці», дэтэктыўны серыял: 7 серыя.
**18.20** Форум (ток-шоў): Еўрапейскія арэлі.
**19.05** Маю права (прававая праграма).
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.35** Гарачы каментар (публіцыстычная праграма).
**19.45** Калыханка для самых маленькіх.
**19.50** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.20** «А калі б так здарылася?», дак. фільм, 2007 г., Польшча.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Госць «Белсату».
**21.40** «Пінеры зменаў. Канада», дак. фільм, 2009 г., Францыя.
**22.30** «Пітбуль», серыял: 12 серыя.
**23.20** «Euromaxx» (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**23.45** Аб'ектыў.
**00.05** Гарачы каментар (публіцыстычная праграма).

## 28 МАЯ, СУБОТА

**07.00** Мультфільмы.
**07.25** Існасць.
**07.55** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.10** Здароўе.
**09.45** «Шэф-кухар».
**10.50** Камедыйны серыял «Сіндром Фенікса» (Расія).
**12.10** «Белыя Росы». Камедыя (СССР).
**13.55** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**14.20** «Час Саюза». Грамадска-палітычнае ток-шоў.
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** Вакол планеты.
**16.15** Nota Bene.
**16.45** Дакументальны цыкл «Атлас «Дыскаверы» (ЗША).
**17.35** Відэафільм АТН «Пад Крычаўскім ветразем» цыклу «Зямля беларуская».
**17.55** «Ваша лато».
**18.45** Латарэя «Пяцёрачка».
**19.20** «Месца сустрэчы». Музычна-забаўляльная праграма.
**21.00** Панарама.
**21.30** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Фінал. Прамая трансляцыя.
**23.50** «Нічога сабе вандроўка». Трылер (ЗША).
**01.25** Дзень спорту.

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Суботняя раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Камедыйны серыял «Мая выдатная няня».
**09.45** «Здароўе».
**10.35** «Смак».
**11.15** «Прыгоды імператара». Анімацыйны фільм.
**12.30** «Разумніцы і разумнікі».
**13.15** Фільм «Музычныя вакацыі».
**15.00** Асяроддзе пасялення.
**16.00** Нашы навіны (з субтытрамі).
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** АНТ прадстаўляе: «Давай ажэнімся!».
**17.20** «Куміры».
**18.20** Камедыя «Модная матуля».
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Фабрыка зорак. Вяртанне».Фінал.
**23.05** «Пражэктарпэрысхілтан».
**23.45** Прэм'ера. Фільм «Казка пра цемру».

**06.05** «Анфас».
**06.20** Фільм «Рукі прэч ад Місісіпі». Германія, 2007 г.
**08.00** Фільм «Уцёкі». Францыя, 1978 г.
**09.40** «Давай паспрабуем?».
**10.30** «Мінск і мінчане».
**11.05** СТБ прадстаўляе: «КультУРА!».
**11.40** «Салдаты. Дзембель непазбежны!» Серыял.
**13.30** «Новыя прыгоды дылетанта».
**14.00** Фільм «Перакрыжаванне». Расія, 1998 г.
**16.00** «Вайна ад першай асобы». Дакументальны фільм.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.45** «Наша справа».
**17.00** «Вялікі горад».
**17.35** Фільм «Старая сяброўка». Расія, 2006 г.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10** «Зорны рынг».
**21.30** Фільм «Шанхайскія рыцары». ЗША-Вялікабрытанія-Чэхія, 2003 г.
**23.35** Фільм «Небяспечная прырода». Аўстралія, 2008 г.

**07.45** Нашы тэсты.
**08.15** Усё аб бяспецы.
**08.45** Рэальны свет.
**09.20** Дыялогі аб рыбалцы.
**09.50** Жансавет.
**10.30** Дача здароўя.
**11.15** Тэлебарометр.
**11.20** Серыял «Дзяржаўная мяжа».
**12.40** «Ты і Я-2». Забаўляльнае ток-шоў (Расія). Заключны выпуск.
**13.45** «Страсці па культуры».
**14.25** «Лабірынты мастацкай культуры Заходняй Беларусі».
**14.55** Фільм-фэнтэзі «Крабат. Вучань ведзьмака» (Германія).
**17.10** Тэлебарометр.
**17.15** Вестэрн «Адкрыты прастор» (ЗША).
**19.55** Конкурс-віктарына «Дзеці новага пакалення».
**21.00** КЕНО.
**21.05** Гімнастыка мастацкая. Чэмпіянат Еўропы. Дзень 2-і.
**23.10** Жывы гук.
**23.55** Канцэрт Phil Collins. Finally... The First Farewell Tour.

### РОССИЯ

**07.00** Фільм «Мой пяшчотна каханы дэтэктыў».
**08.35** «Ізмайлаўскі парк». Вялікі гумарыстычны канцэрт.
**10.25** «Ранішняя пошта».
**11.00** Весткі.
**11.10** «Суботнік».
**11.50** Фільм «Арыфметыка кахання».
**13.20** Мультфільмы.
**13.45** «Уся Расія».
**14.00** Весткі.
**14.15** «Пакой смеху».
**15.15** «Сумленны дэтэктыў».
**15.50** «Гарадок». Дайджэст. Забаўляльная праграма.
**17.05** «Улада факту».
**17.55** «Суботні вечар».
**19.00** «Карціна свету».
**19.55** Надвор'е на тыдзень.
**20.00** Весткі ў суботу.
**20.45** Фільм «Пачаць спачатку. Марта». 2008 г.
**00.05** «Дзяўчаты».

### НТВ

**07.35** «Агляд».
**08.00** Сёння.
**08.20** «Выратавальнікі».
**08.50** «Медыцынскія таямніцы».
**09.25** «Жывуць жа людзі!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Галоўная дарога».
**10.50** «Кулінарны паядынак».
**11.55** «Кватэрнае пытанне».
**13.00** Сёння.
**13.20** «Жаночы погляд».
**14.10** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Знакі лёсу».
**16.00** Сёння.
**16.20** «Развод па-руску».
**17.25** «Вочная стаўка».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** «Праграма Максімум».
**20.45** «Руская сенсацыі».
**21.45** «Ты не паверыш!».
**22.45** Прэм'ера. Містычны трылер «Слепата».
**00.50** Вострасюжэтны фільм «Чорны горад».

### EUROSPORT

**09.30** Веласпорт. Джыро д'Італія. 19-ы этап.
**10.30** Тэніс. Адкрыты чэмпіянат Францыі. Дзень 6-ы.
**10.45** Тэніс. Гейм. Сэт. Матс.
**12.00** Тэніс. Адкрыты чэмпіянат Францыі. Дзень 7-ы.
**15.00** Веласпорт. Джыро д'Італія. 20-ы этап.
**18.30** Тэніс. Адкрыты чэмпіянат Францыі. Дзень 7-ы.
**21.30** Тэніс. Гейм. Сэт. Матс.
**22.00** Адзінаборствы. Байцоўскі клуб.
**00.30** Веласпорт. Джыро д'Італія. 20-ы этап.
**01.30** Тэніс. Адкрыты чэмпіянат Францыі. Дзень 7-ы.
**02.30** Тэніс. Гейм. Сэт. Матс.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** Гарачы каментар (публіцыстычная праграма).
**07.30** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**08.00** «Пўаро Агаты Крысці», дэтэктыўны серыял: 7 серыя.
**08.50** «Таямніца Сагалі», серыял: 13 серыя.
**09.20** Калыханка для самых маленькіх.
**10.05** Маю права (прававая праграма).
**10.25** «А калі б так здарылася?», дак. фільм, 2007 г., Польшча.
**11.05** «Euromaxx» (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**11.35** «Пінеры зменаў. Канада», дак. фільм, 2009 г., Францыя.
**12.25** «Пўаро Агаты Крысці», дэтэктыўны серыял: 7 серыя.
**13.20** «Таямніца Сагалі», серыял: 13 серыя.
**13.45** Калыханка для самых маленькіх.
**14.30** «Геніяльны аматар», дак. фільм, 2008 г., Румынія.
**15.15** «Маргарэт Тэтчэр. Дзяцінства правадыркі», дак. фільм, 2008 г., Францыя.
**16.10** «Таямніца крэпасці шыфраў», тэлесерыял: 7 серыя.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Загадкі Мэрдака», дэтэктыўны серыял: 13 серыя.
**17.55** «Яны хацелі забіць Гітлера», дак. фільм: 3 серыя, «Замаховец».
**18.40** Хто ёсць кім?: «Дранько-Майсюк. Цацачны гандляр з Давыд-Гарадка».
**19.05** «Катынь», дак. фільм, 2010 г., Польшча.
**19.30** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма).
**19.45** Калыханка для самых маленькіх.
**19.55** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.25** Вагон (сатырычна-забаўляльная праграма).
**20.30** «Чырвоны беларус», дак фільм, 2009 г., Польшча.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.15** Два на два (тэледыскусія).
**21.40** Суботні сеанс: «Першая сустрэчная», маст. фільм, 1998 г., ЗША.
**23.10** Прыватная калекцыя (агляд культурных падзеяў).
**23.35** Аб'ектыў.

## 29 МАЯ, НЯДЗЕЛЯ

### Першы канал (1)

**07.25** Мультфільмы.
**08.45** «Зброя». Цыкл дакументальных фільмаў (Беларусь).
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.10** «Арсенал».
**09.40** У свеце матораў.
**10.15** «Культурныя людзі».
**10.50** Камедыйны серыял «Сіндром Фенікса» (Расія). Заключная серыя.
**12.10** «Вяселле з пасагам». Камедыя (СССР).
**14.15** Хакей для ўсіх.
**15.15** Навіны рэгіёна.
**15.35** «Ведай нашых».
**15.50** «Астэрыкс і Абелікс супраць Цэзара». Эксцэнтрычная камедыя (Францыя).
**18.05** Суперлато.
**19.15** Канцэрт Іны Афанасьевай «І толькі сны...».
**21.00** У цэнтры ўвагі.
**21.55** «Выпадковыя сувязі» . Забаўляльна-гумарыстычная праграма.
**22.50** «Вяртанне ў Брайдсхед». Меладрама (Вялікабрытанія).

### АНТ

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Нядзельная раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная пропаведзь (з субтытрамі).
**09.20** Камедыйны серыял «Мая выдатная няня».
**09.55** «Шалапутныя нататкі».
**10.15** Пакуль усе дома.
**11.15** Фазэнда.
**11.50** АНТ прадстаўляе: «Ранішняя пошта».
**12.25** Фільм «Падкідыш».
**13.55** АНТ прадстаўляе: «Брэйн рынг».
**15.00** Прэм’ера. «Георгій Грэчка. Я быў у космасе, я веру ў Бога».
**16.00** Нашы навіны (з субтытрамі).
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Фільм «Скарб нацыі».
**18.40** «Эстрадны кактэйль».
**20.00** Контуры.
**21.05** Камедыя «Фатальная красуня». Францыя, 2006 год.
**22.50** «Yesterday live».
**23.50** АНТ прадстаўляе: «Гандбол. Ліга чэмпіёнаў. Фінал».

### СТБ

**07.05** Фільм «Шанхайскія рыцары». ЗША-Вялікабрытанія-Чэхія, 2003 г.
**09.00** СТБ прадстаўляе: «Гаворыць і паказвае Мінск».
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Відавочнік прадстаўляе: самае смешнае».
**10.55** «Вялікі сняданак».
**11.35** «Салдаты. Дзембель непазбежны!» Серыял.
**13.25** «Добры дзень, доктар!».
**14.00** Фільм «Курыца». СССР, 1991 г.
**15.20** «Далёкія сваякі».
**15.35** Ток-шоў «Лёс».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** Фінал: ФК «Гомель»-ФК «Нёман». Прамая трансляцыя.
**19.30** «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**20.40** Фільм «Апошні шанец Харві». ЗША, 2008 г.
**22.25** «Аўтапанарама».
**22.55** «Прафесійны бокс».
**23.50** Фільм «Нага». Расія, 1991 г.

### ЛАД

**07.10** Дабравест.
**07.40** Мір вашай хаце.
**07.50** Фільм-фэнтэзі «Крабат. Вучань ведзьмака» (Германія).
**09.55** Медычныя таямніцы.
**10.35** Медычныя таямніцы +.
**10.55** Школа рамонту.
**12.05** Тэлебарометр.
**12.10** Нашы тэсты.
**12.45** Кінаспробы.
**13.10** «Правы чалавека».
**13.25** Гімнастыка мастацкая. Чэмпіянат Еўропы. Дзень 3-і. Прамая трансляцыя.
**15.35** Бухта капітанаў.
**16.15** Прыгодніцкі анімацыйны фільм «Гарфілд» (ЗША).
**17.40** «Халі-галі». Скетч-шоў.
**18.00** Эксцэнтрычная камедыя «Жандар і жандарметкі» (Францыя).
**19.55** Конкурс-віктарына «Дзеці новага пакалення».
**21.00** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**21.05** КЕНО.
**21.10** «Навіны надвор’я».
**21.45** Смешная часіна.
**22.20** «Злаві мяне, калі зможаш». Дэтэктыў (ЗША).
**00.50** Культасвет.

### РОССИЯ

**07.00** Мультфільм.
**07.45** Фільм «Пачаць спачатку. Марта». 2008 г.
**11.00** Весткі.
**11.15** «Сам сабе рэжысёр».
**12.10** «З новай хатай!».
**12.25** Фільм «На беразе вялікай ракі».
**14.00** Весткі.
**14.15** «Смехапанарама Яўгенія Петрасяна».
**14.50** «Гарады і Весі».
**15.45** Фэст дзіцячай мастацкай гімнастыкі «Аліна».
**17.15** «Гарадок». Дайджэст. Забаўляльная праграма.
**18.10** Канцэрт «Дарослыя і дзеці».
**20.00** Весткі тыдня.
**21.05** 1/8 фіналу першай лігі «КВЗ».
**23.00** «Адмысловы карэспандэнт».

### НТВ

**07.35** «Авіятары».
**08.00** Сёння.
**08.15** «У зоне асаблівай рызыкі».
**08.45** «Іх норавы».
**09.20** «Ямо дома!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Першая перадача». Аўтамабільная праграма.
**10.50** «Баль на ўвесь свет».
**11.55** «Дачны адказ».
**13.00** Сёння.
**13.20** «Справа цёмная». Гістарычны дэтэктыў.
**14.10** Прэм’ера. Дэтэктыўны серыял «Знакі лёсу».
**16.00** Сёння.
**16.20** «Гісторыя ўсерасійскага зману».
**17.25** «І зноў добры дзень!».
**18.30** «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
**19.00** «Сёння. Выніковая праграма».
**20.00** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**20.45** «Цэнтральнае тэлебачанне». Першае інфармацыйнае шоў.
**22.05** Прэм’ера. Вострасюжэтны фільм «Дубля не будзе».
**23.45** «Гульня».
**00.40** «Увага: вышук!».
**01.15** «Футбольная ноч».

### EUROSPORT

**09.30** Веласпорт. Джыро д’Італія. 20-ы этап.
**10.45** Аўтагонкі. Паршэ. Манака (Манака).
**11.30** Тэніс. Гейм. Сэт. Матс.
**12.00** Тэніс. Адкрыты чэмпіянат Францыі. Дзень 8-ы.
**17.00** Веласпорт. Джыро д’Італія. 21-ы этап.
**18.30** Тэніс. Адкрыты чэмпіянат Францыі. Дзень 8-ы.
**21.30** Тэніс. Гейм. Сэт. Матс.
**22.00** Веславанне. Кубак свету. Мюнхен (Германія).
**23.00** Аўтагонкі. Паршэ. Манака (Манака).
**23.30** Футбол. Кубак чатырох нацый. Ірландыя - Шатландыя.
**00.30** Веласпорт. «За кулісамі». Часопіс.
**01.00** Мотаспорт. Часопіс.
**01.15** Тэніс. Адкрыты чэмпіянат Францыі. Дзень 8-ы.
**02.00** Тэніс. Гейм. Сэт. Матс.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб’ектыў.
**07.15** Еўропа сёння.
**07.45** «Загадкі Мэрдака», дэтэктыўны серыял: 13 серыя.
**08.30** «Машына зменаў», тэлесерыял: 10 серыя.
**09.00** Калыханка для самых маленькіх.
**09.40** «Катынь», дак. фільм, 2010 г., Польшча.
**10.05** Два на два (тэледыскусія).
**10.30** «Яны хацелі забіць Гітлера», дак. фільм: 3 серыя, «Замаховец».
**11.15** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**11.45** «Машына зменаў», тэлесерыял: 10 серыя.
**12.15** Калыханка для самых маленькіх.
**12.55** «Сальвадор Аллендэ», дак. фільм, 2004 г., Чылі.
**14.40** «Першая сустрэчная», маст. фільм, 1998 г., ЗША.
**16.10** «Таямніца крэпасці шыфраў», тэлесерыял: 8 серыя.
**17.00** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**17.15** «Час гонару», серыял: 31 серыя.
**18.00** МакраФон: «Рок-карона–2010»: ч. 3.
**18.35** Дакументальная гадзіна: «Рэвалюцыя», дак. фільм, 2007 г., Францыя: 4 серыя, «Аргентына: рэвалюцыя рондаляў і патэльняў».
**19.30** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**19.45** Калыханка для самых маленькіх.
**19.55** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма).
**20.20** ПраСвет (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**20.30** Басанож па свеце (спазнаваўчая праграма).
**21.00** Аб’ектыў (галоўнае выданне).
**21.30** Эксперт (інфармацыйна-аналітычная праграма).
**22.00** Фільматэка майстроў: «Дарога», маст. фільм, 2002 г., Чэхія–Славакія.
**23.40** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма).
**23.50** Тыдзень у «Аб’ектыве».

# Шаноўныя чытачы!

**На жаль, газету «Новы час» немагчыма набыць у шапіках або крамах. Няма нас і ў дзяржаўнай сістэме распаўсюду Белпошты. Але можна падпісацца на «Новы час» і кожны тыдзень атрымліваць газету.**

Падпісацца магчыма на любую колькасць месяцаў, аформіўшы банкаўскі ці паштовы перавод і накіраваўшы копію плацёжнага дакументу на адрас рэдакцыі. (Глядзіце ўзоры квітанцый). Нашы рэквізіты: **рахунак 3012741108019 у аддзяленні №539 ААО «Белінвестбанка», код банка 153100739. Адрас банка: 220004, Мінск, вул. Калектарная, 11. Адрас рэдакцыі: 220113, Мінск, вул. Мележа, 1, офіс 1234.**

Акрамя таго падпісацца можна ў нашых рэгіянальных прадстаўнікоў:

Магілёў: (8 029) 604 34 57, Юрый;
Мінск: (8 029) 968 79 73, Аляксей;
(8 029) 178 31 68, Вольга.

БЕЛПОЧТА

ф. ПС 112

ЭЛЕКТРОННЫЙ ДЕНЕЖНЫЙ ПЕРЕВОД

№ ______ (вход, по карте отправки)

ВЫРУЧКА ☐ НАЛОЖЕННЫЙ ПЛАТЕЖ ☐

(сумма цифрами) (сумма прописью)

ПОЛУЧАТЕЛЬ___ Г-та «Новы час», р/с 3012741108019 отд. №539 ОАО «Белинвестбанк», код 153100739, УНН 190790926

КУДА 220004, г. Минск, ул. Коллекторная, 11
почтовый код, адрес получателя, телефон)

ОТПРАВИТЕЛЬ
почтовый код, адрес отправителя, телефон)

АДРЕС

Доставка ☐ уведомление ☐ простое ☐ заказное ☐ электронное

(назначение платежа)

(письменное сообщение)

Отметки отделения почтовой связи места приема:
(почтовый код, оттиск контрольно-переводной печати, кол. шт.)
№ перевода по ф. 5 _____________
Время приема _______ ч. _____ мин.
Подпись

### Паважаныя чытачы!

Падпісны кошт аднаго нумара газеты 750 руб. аднаго месяца — 3000 руб.

«Новы час» запрашае да супрацоўніцтва распаўсюджвальнікаў газеты ва ўсіх рэгіёнах Беларусі.

**Даведка па тэл: (8 029) 651 21 12.**

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
отд. №539 ОАО «Белинвестбанк»
(наименование банка)

| Счет получателя | 3012741108019 | Лицевой счет | Код 739 |
|---|---|---|---|
| УНП* | 190790926 | | |

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| Период подписки указывает абонент | | | | |
| | | | | |

Плательщик

Пеня ________
Всего ________

Кассир

Для тых, хто прымае рашэнні!
Новы час
www.novychas.org

ЦІКАВА

# КОД ДЖЭРОНІМА

Алег НОВІКАЎ

**«Код Джэроніма» — так называлася аперацыя па ліквідацыі тэрарыста нумар адзін у свеце Усамы Бен Ладэна.**



Тое, што Бен Ладэна ў спецслужбах ЗША называлі Джэроніма (гэтак жа, як і славутага індзейскага правадыра), выклікала пратэсты з боку амерыканскіх індзейцаў.

«Джэроніма мёртвы!» — рапартавала 1 мая каманда спецназаўцаў, адказная за забойства заснавальніка Аль-Каіды. Індзейцы ЗША такой канспірацыі не зразумелі.

Для іх Джэроніма — не тэрарыст, а славуты правадыр племені апачы. Пры жыцці (1829–1909) ён быў жывым сімвалам індзейскага супраціву. Спачатку змагаўся супраць мексіканцаў, якія забілі яго маці, жонку і трох дзяцей, пасля — з амерыканцамі, з якімі спачатку нібыта ладзіў. У 1861 годзе індзейцы пад яго кіраўніцтвам пакінулі тэрыторыю рэзервацыі ў Арызоне. Падобны ўчынак азначаў, што тапор вайны адкапаны.

Амаль 20-гадовае паўстанне Джэроніма (якое на практыцы зводзілася да нападаў на фермераў) зрабіла гэтае імя вядомым на ўсю Амерыку. Калі ў 1886 годзе Джэроніма здаўся, аказалася, што ён быў апошнім індзейцам у Штатах, які вёў вайсковую барацьбу. У дадатак ён не проста здаўся, а запатрабаваў, каб яго прызналі вайсковым палонным. Вашынгтон пагадзіўся.

Пасля арышту Джэроніма, якога перасялілі ў Аклахому, стаў поп-зоркай. Калі ў 1894 годзе ў Сэнт-Луісе адчынілася сусветная выстава, Джэроніма запрасілі прадаваць там сувеніры. Паглядзець на вялікага сахема ехалі з усёй краіны. У 1904-м ён прыняў удзел у інагурацыі прэзідэнта Тэадора Рузвельта.

Паралельна Джэроніма прыняў хрысціянства і нават далучыўся да баптыстаў, адкуль, праўда, пазней быў выключаны за азартныя гульні. У 1909 годзе ён памёр пасля таго, як выпадкова ўпаў з каня. Пасля смерці хадзілі чуткі, што студэнты-масоны выкапалі чэрап Джэроніма, каб ужываць яго ў сваіх тайных рытуалах. Быццам на гэтым чэрапе даваў у свой час клятву прэзідэнт ЗША Джордж Буш-малодшы.



Джэроніма (справа) і яго воіны

Пасля ўсяго гэтага не дзіўна, што карэнныя амерыканцы вельмі эмацыйна адрэагавалі на інфармацыю пра тое, што Бен Ладэна ў файлах ЦРУ празвалі Джэроніма.

«Параўнаць Джэроніма з Бен Ладэнам — масавым забойцам і палахлівым тэрарыстам — гэта дэманстратыўная атака на гістарычную памяць карэнных амерыканцаў», — гаворыцца ў калектыўным лісце лідараў племені апачы, дасланага на днях на імя прэзідэнта ЗША. Як пішуць аўтары, «Джэроніма ніколі, у адрозненні ад Асамы, не хацеў стварыць халіфат. Яго праграма заключалася ў тым, каб племя апачы пакінулі ў спакоі».

«Няўжо мы дасюль знаходзімся ў стане паходу на Захад? Хіба мы дасюль каўбоі? Нашто ў такім разе ўрад да гэтага часу працягвае сімвалічны генацыд індзейцаў? Тое, што наш урад выкарыстаў імя Джэроніма, адлюстроўвае цёмныя старонкі нашай калектыўнай псіхалогіі», — піша Браян МакЛарэн, адзін з лідараў амерыканскіх левых евангелістаў.

З падобнымі заявамі не жадаюць мірыцца кансерватары. На старонках іх выданняў можна сустрэць шмат матэрыялаў, якія аспрэчваюць тэзіс пра тое, што Джэроніма — герой. Сапраўды, пры жыцці Джэроніма забіў шмат цывільных асобаў, і сучаснікі, па вялікаму рахунку, баяліся яго не менш, чым амерыканцы Бен Ладэна і яго шахідаў.

Хтосьці з жыхароў Арызоны ў пятым пакаленні на адным з амерыканскіх інтэрнэт-форумаў згадаў апавяданні дзеда пра тое, што ў часы Джэроніма апачыюнак мог ажаніцца выключна тады, калі прыносіў будучаму цесцю набор з пенісаў, якія адрэзаў у ворагаў.

«American Spectator», адзін з флагманаў амерыканскай кансерватыўнай прэсы, адзначае: «Трэба прызнаць, што тубыльцы да з'яўлення янкі жылі ў стане перманентнай міжкланавай вайны. Іракезы вынішчылі б гуронаў без дапамогі французаў і англічан. Яны забівалі адзін аднаго задоўга да таго, як сюды прыбылі еўрапейцы. Усе індзейскія цывілізацыі былі заснаваныя на канцэпцыі гвалту і крыві, у той час як хрысціянскія каланісты як мінімум ведалі, што такое прынцып гуманнасці. У гэтым плане назваць аперацыю супраць Бен Ладэна «Код Джэроніма» цалкам нармальна».

**Адміністрацыя ЗША сцвярджае, што не мае ніякіх забабонаў супраць індзейцаў. Выбар на карысць імя Джэроніма адпавядае традыцыі**

У адказ фанаты Джэроніма ўзнялі вельмі актуальную зараз тэму экалогіі. Шмат хто лічыць, што светапогляд індзейцаў мог стаць альтэрнатывай духу надыходзячай у XIX стагоддзі капіталістычнай цывілізацыі.

«Карэнныя амерыканцы ніколі не забівалі бізонаў толькі для таго, каб выразаць у іх языкі, як рабілі белыя траперы. Індзейцы забівалі жывёл селектыўна, каб забяспечыць пражыванне сваім дзецям і нашчадкам. Індзейцы ніколі не знішчылі ніводнага віду жывёлаў, у адрозненні ад белых. У гэтым плане барацьбу Джэроніма супраць белых можна лічыць справядлівай і экалагічнай», — піша адзін з эколагаў.

Аднак ідэя аказалася спрэчнай. Высакародны дзікун, які жыве ў гармоніі з прыродай, — гэта міф, кажуць апаненты. Яны спасылаюцца на вельмі вядомую кніжку «Індзейская экалогія. Міф і гісторыя» (The Ecological Indian: Myth and History). Яе аўтар Шэпард Крэч даследаваў трэнды на рынку скуры баброў ў XIX стагоддзі ў Луізіане і адзначыў пры гэтым цікавую рэч: часам на мясцовым рынку з'яўлялася занадта шмат тавару. Прычынай было тое, што жрэц нейкага індзейскага племені заклікаў забіваць як мага больш жывёл, каб задаволіць бога Маніту. Вось такое разуменне экалогіі.

Між тым, адміністрацыя ЗША сцвярджае, што не мае ніякіх забабонаў супраць індзейцаў. Выбар на карысць імя Джэроніма адпавядае традыцыі: шмат што ў амерыканскім войску звязанае з індзейцамі. У арсенале войску дзядзькі Сэма ёсць ракеты «Тамагаўк», верталёты «Апачы», «Чорны Сокал» і г.д.

У любым выпадку, дыскусія вакол правадыра апачы мае свае пазітыўныя наступствы. Амерыканцы згадалі пра індзейцаў, у якіх праблем традыцыйна хапае. Так, 70 працэнтаў тых жа апачы — далёкіх родзічаў Джэроніма — зараз сядзяць без працы. Рознага кшталту грамадскія арганізацыі ўжо заклікалі адміністрацыю Абамы правесці аперацыю «Код Джэроніма–2», сутнасцю якой павінна быць сацыяльна-эканамічная падтрымка насельніцтва індзейскіх рэзервацый.

## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Празаходні палітык Андрэй Саннікаў стане «разменнай картай», якую Лукашэнка выкарыстоўвае для таго, каб Еўропа адмовілася ад планаў новых санкцый супраць Беларусі. Мінск знаходзіцца ў настолькі цяжкім эканамічным становішчы, што дадатковыя санкцыі наўрад ці яму спадабаюцца. Усяго ў «калодзе» Лукашэнкі да чэрвеня апынецца каля 40 «карт» рознай якасці. Каму і калі атрымаецца выйсці з турмы, залежыць толькі ад Лукашэнкі. У свой час ён памілаваў асуджанага на 5,5 гадоў за хуліганства апазіцыянера Аляксандра Казуліна дзеля паляпшэння іміджу краіны і аднаўлення адносін з Еўропай. Незразумела пакуль (прынамсі да завяршэння ўсіх судовых працэсаў), якія будуць умовы новага размену і колькі карт Лукашэнка пакіне сабе.

**Лента.ру (Расія)**

Эканамісты не думаюць, што праблемы беларускай эканомікі могуць перакінуцца на іншыя краіны Усходняй Еўропы, у сувязі з тым, што краіна маленькая і знаходзіцца ў ізаляцыі. Аднак растучыя эканамічныя праблемы ставяць пад сумнеў здольнасць краіны выплачваць свае абавязкі і прыцягваць новае фінансаванне. Сваё вартае жалю становішча беларускія ўлады яшчэ больш пагоршылі, засудзіўшы кандыдата ў прэзідэнты Андрэя Саннікава.

**«Wall Street Journal» (ЗША)**

Хаця Крэмль не так катэгарычна рэагуе на парушэнні правоў чалавека ў краіне, як Захад, расійскія лідары даўно страцілі цярпенне ў адносінах да непрадказальнага беларускага кіраўніка ў сувязі з яго адмовай падтрымліваць некаторыя палітычныя ініцыятывы Масквы і адмовай адкрыць беларускую эканоміку для расійскіх інвестыцый. Аднак Расія працягвае працаваць з Беларуссю і не зацікаўлена ў яе банкруцтве.

**«Christian Science Monitor» (ЗША)**

Прысуд Саннікаву сімвалізуе бяссілле Еўропы. Захад, наогул, распачаў спробу, хай і недастатковую, паслабіць жалезную хватку Лукашэнкі ўнутры краіны. Гэта спроба не ўдалася. Зрэшты, той факт, што Мінск тупа рэагуе толькі на эканамічныя стымулы, тлумачыцца пазіцыяй не столькі Захаду, колькі Масквы. На нейкі час Беларусь і Расія пасварыліся. Але затым, за некалькі дзён да прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі, Мядзведзеў стаў на бок афіцыйнага Мінску. Зразумела, не без карыслівых меркаванняў, тым не менш гэты факт надаў Лукашэнку ўпэўненасць у тым, што Масква для беларусаў усё яшчэ бліжэй за Брусэль. Еўрасаюзу даводзіцца прызнаць: Захад не можа паўплываць на рэжым у Беларусі, а Расія не жадае. Для Лукашэнкі гэта — суцяшальная перспектыва.

**«Suddeutsche Zeitung» (Германія)**

Катастрафічная дэвальвацыя нацыянальнай валюты, адсутнасць золатавалютных рэзерваў, сотні тысяч беспрацоўных — былая савецкая рэспубліка Беларусь на краю прорвы. Чыннікі крызісу: папуліцкія перадвыбарныя абяцанні прэзідэнта-аўтакрата Аляксандра Лукашэнкі і эканоміка, якую не рэфармавалі яшчэ з часоў СССР. Здаецца, адзіны шанец рэжыму Лукашэнкі выратаваць сваю эканоміку — гэта атрымаць крэдыт за мяжой.

**«Cyberpresse» (Канада)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### РАСІЯ. ВЕРНІКІ АПОСТАЛА ПУЦІНА

Аказваецца, што яшчэ ў 2005 годзе пад Ніжнім Ноўгарадам узнікла секта вернікаў, якія лічаць, што Пуцін — рэінкарнацыя апостала Паўла. Лідар секты, маці Фаціньня, сцвярджае, што на Пуціна сышоў Святы Дух. Адбылося гэта пасля таго, як ён стаў прэзідэнтам. А раней, быццам, Пуцін служыў цёмным сілам — КДБ. Як не дзіўна гучаць ідэі Фаціны, якая сцвярджае, што нават перапісваецца з Уладзімірам Уладзіміравічам, яны карыстаюцца фантастычнай папулярнасцю сярод простых расіян. Па словах сведак, да яе едуць з усёй краіны, на яе імя перапісваюць вялізарныя сумы, шмат хто гатовы задарма працаваць на яе. Цікава, што гімнам секты з'яўляецца вядомая савецкая дзіцячая песня «Пусть всегда будет солнце». Апошнім часам сектанты сталі настолькі заўважнымі, што прэс-сакратар прэм'ера РФ быў вымушаны зрабіць спецыяльную заяву, у якой адзначаецца, што прэм'еру імпануе высокая адзнака яго дзейнасці, але не трэба забывацца на запаведзь «Не ствары сабе куміра». Дарэчы, Фаціньня да таго, як пайшла ў секту, сядзела ў труме за махінацыі.

**По матэрыялах расійскай прэсы**

### КЫРГЫЗСТАН. ДЭБАТЫ ВАКОЛ ЗМЕНЫ СЦЯГА

У Кыргызстане пачаліся спрэчкі наконт змены сцяга. Ініцыятары кажуць, што цяперашні чырвоны колер сцяга асацыюецца з крывёй. Менавіта таму ў Кыргызстане прайшлі кровапралітныя канфлікты. У якасці альтэрнатывы прапануюць узяць за аснову сцяг Кіргізскай ССР, дзе апроч чырвонага поля прысутнічалі таксама сіні і белы колеры. «Сіні колер сцяга сімвалізаваў бясконцае неба, чыстую ваду. Цяперашні чырвоны сцяг краіны шмат у каго асацыюецца з крывёй. Можа, адсюль усе нашы рэвалюцыі, беспералынныя беспарадкі ў краіне і хаос?» — кажа адзін з прыхільнікаў рэформы. У яго хапае апанентаў. «Калі вам паўсюль бачыцца кроў, то трэба звярнуцца да лекара. Мы не павінны апускацца да ўзроўню шаптух, мы не павінны верыць усякім забабонам толькі з-за таго, што дэпутату саснілася кроў», — сказаў прыхільнік цяперашняй сімволікі. Дзяржаўны сцяг Кыргызстана зараз уяўляе сабой палатно чырвонага колеру, у цэнтры якога размешчаны сонечны дыск з 40 праменямі, усярэдзіне якога чырвоным колерам намаляваны тундук — рашэцістая адтуліна ў купале юрты для яе асвятлення і выйсця дыму. Тым часам ідэя змены сцяга выклікала вялікі грамадскі рэзананс. Да абмеркавання змены сцяга далучыліся шматлікія жыхары Кыргызстана. У інтэрнэце ўжо створаныя інтэрнэтсупольнасці за і супраць старога сцяга.

**Па матэрыялах кіргізскай прэсы**

### ФРАНЦЫЯ. НА МЯЖЫ ДЫПЛАМАТЫЧНАЙ ВАЙНЫ



Усё пачалося 13 мая, калі французскі МЗС заявіў, што вельмі расчараваны «несяброўскім і агрэсіўным жэстам з боку ўраду Яе Вялікасці». Нежаданне сябраваць і агрэсіўнасць англічан праявіліся ў тым, што кансерватыўна-ліберальны кабінет Дэвіда Кэмерана заклікаў кіраўнікоў 25 краін, якія ўваходзяць у склад ЕС, як мага хутчэй змяніць прапіску еўрапейскага парламента. Як вядома, зараз еўрапейскі парламент чымсьці нагадвае вандроўны цырк. Парламенцкія камітэты, камісіі, кіраўнічыя структуры знаходзяцца ў Брусэлі, а сам парламент засядае два разы на год непасрэдна ў Страсбургу. Рэгулярныя ваяжы дэпутатаў з Брусэля ў Страсбург і назад каштуюць еўрапейскім падаткаплацельшчыкам нямала. Аднак нават калі ініцыятыва брытанцаў была б суперправільнай, у вачах французаў яна з'яўляецца сімвалічным замахам на гонар французскай нацыі. «Францыя будзе выкарыстоўваць усе магчымыя сродкі, каб абараніць парламент у Страсбургу», — кажа прадстаўнік французскага дыпламатычнага ведамства.

**Па матэрыялах «Le Monde» (Францыя)**

### БЕЛЬГІЯ. АМНІСТЫЯ ДЛЯ ЖОНКІ ПЕДАФІЛА

Мішэль Марцін, жонка вядомага бельгійскага педафіла Марка Дзютро, выйдзе на волю праз пару тыдняў. Такое рашэнне прыняў спецыяльны суд, які разглядае скаргі вязняў. Нагадаем, што за краты Мішэль трапіла ў 1996 годзе ў рамках справы свайго мужа, якога абвінавацілі ў забойстве і згвалтаванні 6 дзяўчынак, самай старэйшай з іх было 8 гадоў. Сам Марк атрымаў пажыццёвы турэмны тэрмін, а яго жонку адправілі на нары на 30 гадоў. Аднак свой тэрмін яна цалкам не дасядзела. Праз 15 гадоў яе вырашана вызваліць. Рашэнне выклікала шок у сем'яў ахвяр педафіла і шматлікіх юрыстаў. Яны не разумеюць, як можна выпускаць на волю асобу, якая, адпаведна матэрыялам справы, прымала непасрэдны ўдзел у здзеках з дзяўчынак. Так, адну дзяўчынку яна марыла голадам, у выніку чаго тая памерла. Чыноўнікі, адказныя за рашэнне пра вызваленне мадам Дзютро, спасылаюцца на яе паводзіны на зоне. Па іх словах, яна стала вельмі набожнай і каецца ў сваіх злачынствах. У бельгійскім грамадстве зноў адрадзіліся чуткі пра тое, што Дзютро быў звязаны з некаторымі педафіламі — сябрамі ўраду.

**Па матэрыялах бельгійскай прэсы**

ВЫБАРЫ

# НЕЗАЛЕЖНАЯ ШАТЛАНДЫЯ

*Алег НОВІКАЎ*

**Аб'яднае Каралеўства Вялікабрытаніі хутка можа ператварыцца ў Англійскае Каралеўства. Сенсацыйная перамога на выбарах шатландскіх нацыяналістаў адчыняе зялёнае святло адраджэнню незалежнай Шатландыі.**




Калі мінулай восенню Алекс Сэлманд — прэм'ер Шатландыі і лідар Нацыянальнай шатландскай партыі (SNP) — заявіў пра адтэрміноўку рэферэндуму пра незалежнасць, нацыяналісты плакалі. Гэты сумны дзень параўноўвалі з 22 ліпеня 1298 года, калі англічане разбілі шатландцаў, якімі кіраваў Уільям Уолес (менавіта пра яго распавядае папулярны фільм «Адважнае сэрца» з Мэлам Гібсанам у галоўнай ролі).

Плебісцыт, нагадаем, давялося адмяніць з-за кепскіх дадзеных сацыялагічных апытанняў. Паводле лічбаў, за пачатак т.зв. devolution (працэс выхаду рэгіёну са складу Вялікабрытаніі) гатовыя былі галасаваць максімум 30 працэнтаў электарату. Такая была рэакцыя насельніцтва на крызіс, адказнасць за які часткова пераклалі на ўрад, які фармавала SNP.

Сэлманд казаў, што ў такіх умовах лепш не рызыкаваць. Стаўка, па яго словах, занадта вялікая: у выпадку правалу плебісцыту тэма незалежнасці вернецца ў палітычную павестку дня толькі праз 10–15 гадоў. У якасці кампенсацыі прэм'ер прапанаваў прызначыць новую дату рэферэндуму пасля 5 мая (дзень выбараў у шатландскі парламент). У такі аптымістычны сцэнар мала хто верыў. Прызначыць рэферэндум можа толькі партыя-пераможца, а на той момант рэйтынг нацыяналістаў быў значна ніжэй, чым лейбарыстаў (галоўныя канкурэнты SNP).

Аднак прыйшло 5 мая — і ўсе прызналі палітычны геній Сэлманда. Пад яго кіраўніцтвам партыя мабілізавалася і зрабіла палітычны цуд: па выніках выбараў у нацыяналістаў 69 мандатаў (усяго ў шатландскім парламенце 129 дэпутацкіх месцаў). Нацыяналісты павялічылі сваё прадстаўніцтва на 23 дэпутата. За іх галасавала 45 працэнтаў выбаршчыкаў. Як вынік, Сэлманд застаецца прэм'ерам. Праект незалежнай Шатландыі не знік, а наадварот, здаецца, як ніколі блізкі да рэалізацыі.

Зараз усе палітычныя эксперты Вялікабрытаніі намагаюцца зразумець, што ж здарылася. Безумоўна, сваю ролю згуляла харызма лідара SNP. Згадваюць, што Сэлманд мае вялікі талант пераконваць людзей. У 1990 годзе ён здолеў давесці Шону Конэры, самаму славутаму шатландцу ў свеце, тое, што галасаваць трэба выключна за SNP. Ахвярамі яго чараў сталі іншыя вядомыя людзі ў краі, напрыклад, уладальнік суперпапулярнага клубу «Глазга Рэйнджарс». Пры гэтым асобы, якіх Сэлманд перакаваў у нацыяналісты, не толькі аддавалі галасы за SNP, аднак часта ставаліся партыйнымі донарамі.

Шмат каму імпануе энтузіязм Сэлманда, калі гаворка ідзе пра незалежнасць. У адрозненні ад SNP, ні лейбарысты, ні кансерватары не маюць глабальных альтэрнатыўных праектаў. Пры гэтым, аднак, Алекс не пераходзіць мяжу. Так, Сэлманд выступае за тое, каб фармальным кіраўніком будучай незалежнай Шатландыі заставалася каралева Елізавета. У час кампаніі ён расставіў акцэнты так, каб слова «незалежнасць» было хутчэй звязанае з правам шатландцаў самім кантраляваць публічныя фонды.

Таксама варта згадаць, што за пяць гадоў знаходжання ва ўрадзе нацыяналісты давялі, што могуць быць кампетэнтнымі адміністратарамі. Іх перасталі трымаць за гаваруноў. Да іх пачаў прыглядвацца буйны бізнэс.

Ёсць аб'ектыўныя фактары трыумфу SNP. Да іх можна аднесці катастрафічнае падзенне папулярнасці лібералаў. Такім аказаўся вердыкт выбаршчыка ўза тое, што партыя Ніка Клега пагадзілася на кааліцыю з торы. Галасы ліберальнага электарату дасталіся галоўным чынам нацыяналістам.

Нельга не згадаць левы характар выбарчай праграмы SNP. Нацыяналісты абяцалі адмяніць плату за навучанне ў ВНУ, адмяніць шэраг камунальных падаткаў, аптымізаваць працу медычных службаў. У сваю чаргу, лейбарысты не асмеліліся фармуляваць такія радыкальныя лозунгі, што пазбавіла іх іміджу галоўнай сацыяльнай партыі.

Цяпер праціўнікі залізваюць раны. Усе тры партыі, якія знаходзяцца ў апазіцыі да нацыяналістаў, цалкам змянілі кіраўніцтва. Актыўна перагледаюцца былыя праграмныя канцэпцыі, у якіх значнае месца займала крытыка незалежніцкага праекту. На старонках левай прэсы ўсё часцей гучаць заклікі, каб шатландскія лейбарысты ўвогуле мелі цалкам незалежную ад Лондана структуру, каб быць бліжэй да мясцовая тэматыкі. Адным з джокераў было тое, што SNP займаўся эксклюзіўна шатландскімі праблемамі.

Яшчэ большая сенсацыя здарылася 6 мая. Адпусціць Шатландыю нечакана пагадзіліся нават кансерватары. Прэм'ер Дэвід Кэмеран заявіў, што кабінет Яе Вялікасці не будзе чыніць праблем для правядзення рэферэндуму пра незалежнасць. Раней торы былі ў жорсткай апазіцыі да SNP, казалі, што ідэя рэферэндуму супярэчыць асновам брытанскага права.

Ёсць думка, што ў шэрагах кансерватараў існуе план аддзялення Шатландыі. У такім выпадку ў парламенце не будзе шатландскай квоты, якая традыцыйна складаецца з лейбарыстаў. Да прыкладу, за апошнія 20 гадоў толькі адзін раз кансерватыўны дэпутат перамагаў у Шатландыі. Калі не будзе горцаў, кансерватары гарантуюць сабе парламенцкую большасць на пару дзесяцігоддзяў наперад.

Сярод шараговых англічан папулярная думка пра тое, што шатландцы — гэта паразіты, якія шыкуюць, дзякуючы датацыям з цэнтру. Сапраўды, датацыі вялікія (агульныя субсідыі Шатландыі штогод складаюць 8 мільярдаў фунтаў. У гэтым асяроддзі папулярны выраз: «Хопіць будаваць шатландскую незалежнасць за кошт англічан!»

Аднак самі нацыяналісты не спяшаюцца з рэферэндумам. Сэлманд кажа, што, хутчэй за ўсё, ён будзе прызначаны на другую палову яго пяцігадовай кадэнцыі. Акрамя таго, гаворка будзе ісці не пра незалежнасць, а толькі пра фіскальную аўтаномію. Такі манёўр укладваецца ў стратэгію нацыяналістаў. Зараз, адпаведна апытанням, поўнай незалежнасці жадае толькі траціна шатландцаў. Затое абсалютная большасць выступае за пашырэння эканамічнай і фінансавай аўтаноміі. Абяцаючы незалежнасць у будучым і аўтаномію зараз, Сэлманд стварае шырокі сацыяльны блок, які ў перспектыве будзе гатовы прагаласаваць за адраджэнне шатландскай дзяржавы.

Аглядальнікі не бачаць тут нічога дзіўнага. Сэлманд — палітык з катэгорыі long player (доўгатэрміновы). Ён будзе чакаць зручнага часу, каб атрымаць гарантаваную перамогу. Гэта яго стыль. Нияк ён прызнаецца, што з'яўляецца антыподам галоўнага героя фільма «Адважнае сэрца», які марыў дабіцца незалежнасці за кошт адной удалай бітвы з англічанамі.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# ВЫБУХ У КАЗАХСТАНЕ

**Пасля Беларусі тэрарызм прыйшоў у Казахстан. 18 мая ў прыёмнай аддзялення Камітэта нацыянальнай бяспекі (аналаг нашага КДБ) горада Актобе прагучаў выбух. Пра версіі, рэакцыю грамадства і ўлады журналіст «НЧ» Алег Новікаў размаўляе з палітолагам з Казахстана Андрэем Грышыным.**



**Інфармацыя Генпракуратуры Казахстана:**
17 мая ў горадзе Актобе (былы Акцюбінск) у 9.30 па мясцовым часе падазраваны ў здзяйсненні злачынства ў складзе арганізаванай злачыннай групы Макатаў Рахымжан Арынбасаравіч, 1986 года нараджэння, з мэтай ухілення ад адказнасці, знаходзячыся ў будынку дэпартамента Камітэта нацыянальнай бяспекі (КНБ), здзейсніў акт самападрыву. У выніку выбуху былі забітыя два чалавекі. Смяротнік выкарыстоўваў самаробную прыладу невялікай магутнасці.

***— Калі чытаеш афіцыйную версію, нельга не заўважыць адну супярэчнасць. Яна тычыцца дзіўнай прававой трактоўкі ўчынку Макатава — «акт самападрыву». Хіба ў казахскім заканадаўстве ёсць такая форма злачынства?***

— Натуральна, не. Папросту ўлады Казахстана ўпарта адмаўляюцца прызнаць выбух тэрарыстычным актам.

***— З чым гэта можа быць звязана?***

— Жаданне казахстанскіх уладаў звесці ўсё, што адбылося ў Актобе, да банальнай крымінальшчыны звязаная з макрапалітыкай: палітычная стабільнасць у рэспубліцы лічыцца ледзь не галоўным дасягненнем Казахстана за гады незалежнасці і рэжыму Нурсултана Назарбаева. Аднак эксперты даўно папярэджваюць, што стабільнасць гэта надзвычай далікатная. Яна трымаецца выключна на асобе першага прэзідэнта.

***— А ці былі ў Казахстане раней тэракты?***

— Гэта першая ў Казахстане атака смяротніка. Іншых тэрактаў я не магу прыгадаць. У 2008 годзе ў тым жа Актобе арыштавалі сяброў ісламісцкай групы «Азамат», якія быццам рыхтавалі выбух. Іх засудзілі на 12 гадоў. Аднак у гэтай справе шмат незразумелага. Таксама, як і ў справах актывістаў руху за Рускую рэспубліку. Іх абвінавацілі ў падрыхтоўцы паўстання рускамоўнага насельніцтва за выхад паўночных абласцей са складу Казахстана і далучэння іх да Расіі. Аднак гэта былі толькі намеры. Да канкрэтных акцый гвалту справа не даходзіла.

***— Значыць, тое, што адбылося ў Актобе, больш падобна на тэрарыстычны акт?***

— Пра гэта цяжка казаць дакладна, таму што адсутнічае інфармацыя. Адказнасць за выбух у Актобе дасюль не ўзяла на сябе ніводная з тэрарыстычных арганізацый. Аднак на выхадку вар'ята-адзіночкі гэта ўсё ж мала падобна: занадта добра ён быў падрыхтаваны. Пояс шахіда — дзіўная экіпіроўка для крымінальніка, які імкнуўся, па словах пракуратуры Казахстана, «ухіліцца ад адказнасці». Калі Макатаў хацеў «ухіліцца», дзіўным выглядае яго рашэнне бегчы ад адказнасці наўпрост у прыёмную абласнога аддзялення КНБ. Так што, хутчэй за ўсё, мы ўсё ж такі маем справу з тэрактам, які здзейсніў самазабойца. Здаецца, да такой думкі схіляюцца і спецслужбы. Інакш бы яны не паводзілі сябе так, як зараз. Ідуцьператрусы і затрыманні каўказцаў, якія жывуць у Актобе.

***— Чаму каўказцы трапілі ў фокус інтарэсу КНБ?***

— Актобе знаходзіцца на мяжы з Расіяй. Расійска-казахстанская мяжа вельмі празрыстая. Гэтым актыўна карыстаюцца баевікі разнастайных незаконных узброеных фармаванняў на Паўночным Каўказе (перш за ўсё — у Дагестане), якія за апошні час ператварылі Заходні Казахстан фактычна ў сваю тылавую базу. Ёсць думка, што мясцовыя ўлады да апошняга часу спецыяльна імкнуліся не заўважаць прысутнасці прадстаўнікоў паўночна-каўказскіх узброеных фармаванняў на сваёй тэрыторыі. За гэта, па маўклівай дамове з уладамі, баевікі не рабілі на тэрыторыі Казахстана нічога злачыннага. Магчыма, нешта парушыла гэтую дамову. Яшчэ адзін доказ на карысць каўказскага следу: пояс шахіда — тыповая зброя тэрарыстаў з Паўночнага Каўказу.

***— Як грамадства рэагуе на падзею ў Актобе? Ці вераць простыя людзі ў версію ўлады?***

— Безумоўна, шмат у каго гэта выклікала шок. «Няўжо да нас таксама прыйшоў тэрарызм?» — можна часта пачуць на вуліцах. Я б не сказаў, што ёсць стоадсоткавы давер да версіі ўлады. Усё ж такі дробны крымінальнік пра выбух, ды яшчэ ў будынку КНБ, у якасці шахіда не думае. Яму значна лягчэй на зону сесці і там перабівацца, чым дэманстратыўна падарваць сябе. Нехта кажа, што Макатаў быў псіхам. Ёсць думка, што яго папросту давялі да такога кроку.

***— Каўказская версія хутчэй працуе на карысць тэзісу пра тое, што ў Казахстане ўсё спакойна.***

— Інцыдэнт у Актобе адбыўся праз месяц пасля праведзенай казахстанскім спецназам аперацыі ў адным з прыгарадаў Алма-Аты па ліквідацыі арганізаванай злачыннай групы. Падчас аперацыі былі забітыя два чалавекі. Прэса, са спасылкай на свае крыніцы, сцвярджае, што гэта былі не злачынцы, а эмісары, якія «адмыслова прыехалі ў Казахстан для стварэння мясцовага ісламісцкага падполля». Справа ў тым, што Казахстан, з аднаго боку, шматэтнічная краіна, дзе многа дыяспар. З другога — краіна, якая мае празрыстыя межы. Таму ўсе рэгіянальныя экстрэмісцкія рухі — тыя ж уйгуры або каўказцы — выкарыстоўваюць край у якасці базы, пры гэтым асабліва не канфліктуючы з уладамі. Зараз у адносінах бакоў назіраецца канфлікт.

***— Чым ён можа быць выкліканы?***

— Сілавікі маглі выпадкова зачапіць бізнэс-інтарэсы адной з дыяспар. Тая вырашыла адпомсціць. Праўда, нехта кажа, што пасля ўступлення Казахстану ў Мытны саюз адносіны ўлады і дыяспар, звязаных з палітычным экстрэмізмам, будуць пераглядацца. Быццам гэтага патрабуе Масква, якая не хацела, каб узбекскія, уйгурскія, курдскія і іншыя экстрэмісты, якія жывуць у Казахстане, маглі спакойна падарожнічаць у Расію. А магчыма, нашы спецслужбы самі разарвалі мір. Уся краіна трымаецца на Назарбаеве, якому ўжо за 70. Калі з ім нешта здарыцца, нельга выключыць канфрантацыі ўнутры краіны, якой могуць скарыстацца экстрэмісты. Вось нашы чэкісты і заварушыліся. У любым выпадку, імідж рэжыму з-за выбуху аказаўся вельмі падмочаны. Хаця шмат што яшчэ будзе залежыць ад вынікаў следства.

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ

### МІКОЛА АЗАРАЎ



Украінскі прэм'ер спрабуе нешта рабіць, каб астудзіць палітычную атмасферу ў грамадстве пасля падзей 9-га мая ў Львове. Нагадаем, што ў гэты дзень у Львове мелі месца сутычкі нацыяналістаў і групы ветэранаў, абараняць якіх прыехалі з Крыму і Адэсы сябры розных прарасійскіх арганізацый. У якасці выйсця Азараў заклікаў да забароны галоўнай нацыяналістычнай групоўкі аб'яднання «Свабода» (лідар Алег Цягнібок). Ініцыятыва незвычайная, паколькі, як вядома, Партыя Рэгіёнаў раней давала грошы Цягнібоку, каб той адцягнуў галасы аранжавай апазіцыі. У гэтым плане шмат хто не верыць, што Азараў усур'ёз збіраецца зачыняць «Свабоду». З іншага боку, сітуацыя на Заходняй Украіне сапраўды выходзіць з-пад кантролю. Усіх шакаваў выпадак у тым жа Львове, калі свабодаўцы ўварваліся ў кабінет губернатара і прымусілі яго падпісаць заяву пра адстаўку. Не спяць у шапку і славянафілы. На ўсходзе Украіны пачалася кампанія байкоту тавараў, якія выраблены ў Галіцыі. Кампанія называецца «Я не хачу карміць нацыкаў». На думку экспертаў, эмоцыі спадуць не раней за 22 чэрвеня, калі чакаецца чарговае супрацьстаянне. У адказ на візіт у Львоў 9 мая славянафілаў свабодаўцы вырашылі 22 чэрвеня прыехаць у Адэсу і прайсці маршам па вуліцах. У фінале праграмы мерапрыемства — урачыстая закладка каменя на месцы будучага помніка салдатам дывізіі СС «Галіччына». Думаецца, што бойка гарантаваная.

### СЕБАСЦЬЯН НЕРЦ



Новы старшыня нямецкай Партыі піратаў, Нерц быў абраны на пасаду партыйнага боса па выніках партыйнага сходу, які адбыўся на мінулым тыдні. Партыя піратаў не прадстаўленая ні ў адным з нямецкіх парламентаў, аднак інтарэс да яе вельмі вялікі. Партыя піратаў, галоўным лозунгам якой ёсць скасаванне аўтарскага права на кампутарныя праграмы і свабода ў інтэрнэце, самая вялікая з нямецкіх партый, якія не набралі на выбарах 5 працэнтаў галасоў, неабходных для таго, каб трапіць у Бундэстаг. На апошніх федэральных выбарах за Партыю піратаў галасавалі 2,4 працэнта (больш за мільён чалавек). Лічба неверагодная, асабліва з улікам таго, што партыя была створаная за год да дня галасавання. Наўрад ці за два гады, якія засталіся да наступных выбараў у Бундэстаг, піраты змогуць узняць свой рэйтынг, аднак маючы мільён выбаршчыкаў паўплываць на расклад у новым парламенце яны дакладна здольныя. Не выключана, што Нерц і яго партыя могуць стаць уладальнікамі залатой акцыі і будуць вырашаць фармат будучага парламенту і кабінету. З іншага боку, не выключана, што піраты могуць стаць самастойным палітычны акторам. Усё залежыць ад вынікаў выбараў у гарадскі савет Брэмена, прызначаных на 22 мая. У Брэмене, які мае статус зямлі, у Партыі піратаў нядрэнныя шансы ўвайсці ў парламент, паколькі тут галасуюць з 16-ці год. Праграма Партыі піратаў падабаецца, як правіла, тынэйджарам.

### МАМАТА БАНЕРДЖЫ



Лідар партыі «Trinomool Congress» паклала канец 34-гадоваму дамінаванню камуністаў-марксістаў у штаце Заходняя Бенгалія Індыі. У партыі Маматы 75 працэнтаў месцаў у мясцовым парламенце. Перамога проста незвычайная з улікам таго, што партыя была створаная толькі ў 1994 годзе. Прычым ніякай асаблівай ідэйная платформы партыя не мае і цалкам будуецца на харызме 56-гадовай жанчыны, якую аднапартыйцы называюць «мама». Адпаведна гучыць і выбарчы слоган партыі: «Мама, зямля, народ». Партыя Маматы — гэта партыя нацыянальных меншасцяў Заходняй Бенгаліі, і перш за ўсё мусульман, якія складаюць больш за чвэрць насельніцтва штата і жывуць у сельскіх раёнах. Эксперты кажуць што Мамаце вельмі пашанцавала: яе партыя прыйшла ў палітыку, калі камуністы ўжо ўсім надакучылі і народ гатовы галасаваць хоць за каго. Тым часам хацелася б згадаць гісторыю з Маматай, якая так і просіцца стаць сюжэтам для індыйскага фільму. Мамата зрабіла сабе імя дзякуючы справе Рамана (ісламскі хлопец, якога забіла паліцыя). Яна правяла ўласнае расследаванне і ўстанавіла, што хлопца забілі па просьбе брата дзяўчыны, якая кахала Рамана. Брат, фанатычны індуіст, гатовы быў пайсці нават на забойства, каб не дапусціць шлюбу сястры з мусульманінам.

ЭМІГРАЦЫЯ

# БЕЛАРУСКАЯ КАНАДА

Наталля ГАРДЗІЕНКА

Цягам больш як шасці тыдняў, што я правяла ў Канадзе па запрашэнні Згуртавання беларусаў, я пабывала ў розных гарадах, перагледзела тысячы старонак дакументальных сведчанняў беларускай прысутнасці ў гэтай краіне, сустракалася з рознымі людзьмі старой і новай эміграцыі, запісвала інтэрв'ю. Розныя асобы, часам трагічныя лёсы, часам вельмі паспяховыя... Цікавыя чалавечыя гісторыі...

Менавіта такім канкрэтным людзям, якіх я бачыла на старых здымках і старонках архіўных дакументаў, а таксама з якімі я сустракалася асабіста ў часе падарожжа, будуць прысвечаныя наступныя мае матэрыялы на старонках «Новага часу». Магчыма, праз гэта і ўся Беларуская Канада стане крыху бліжэйшаю для суродзічаў у Беларусі.



Наталля Гардзіенка. Кандыдат гістарычных навук, аўтар кніг «Беларусы ў Аўстраліі» (Мінск, 2004), «Беларусы ў Вялікабрытаніі» (Мінск, 2010)

**Да апошняга моманту я не верыла ў тое, што маё канадскае падарожжа ўсё ж адбудзецца. І нават калі нарэшце апынулася ў аэрапорце Пірсана ў Таронта, яшчэ да канца не ўсведамляла, што на запрашэнне Згуртавання беларусаў Канады я буду больш за месяц тут збіраць матэрыялы для новай кнігі, прысвечанай ім — мясцовым беларускім эмігрантам.**

## Перадгісторыя

Беларуская Канада і была, і не была прадстаўлена ў літаратуры і публіцыстыцы. У савецкія часы, калі Таварыства па сувязях з суайчыннікамі за мяжой актыўна кантактавала з прасавецкай Федэрацыяй рускіх канадцаў (створанай прадстаўнікамі міжваеннай эміграцыі, пераважна беларусамі), час ад часу выдаваліся адпаведныя брашуры. Тут пісалася пра падарожжы ў Канаду, спатканні з тымі беларусамі і пра іх «моцную тугу па Радзіме». Некаторыя з былых суайчыннікаў і сапраўды вярталіся ў БССР, і нават рабіліся аўтарамі кніг, як Іван Шарынскі, што выдаў у 1969 годзе «Странствия по Канаде».

Аднак у гэтых выданнях зусім не згадвалася пра беларусаў, якія трапілі ў Канаду пасля другой сусветнай вайны. Значная іх колькасць — былыя вайскоўцы славутай Арміі Андэрса ды перамешчаныя асобы. Яны стварылі тут беларускую дыяспару, гісторыя якой налічвае ўжо больш за 60 гадоў. Гэта былі прынцыповыя антыкамуністы, і сваю гісторыю яны спрабавалі пісаць самі. Была англамоўная «Гісторыя беларусаў Канады» (1981) доктара Яна Садоўскага, была вялікая кніга Раісы Жук-Грышкевіч, прысвечаная жыццю і дзейнасці мужа, старшыні Рады БНР, былі кнігі такіх жа адданых жонак Марыі Ганько і Вольгі Грыцук пра сваіх мужоў — грамадскіх дзеячаў дыяспары, былі ўспаміны Івонкі Сурвілы.

І нягледзячы на ўсё гэта Канада заставалася найменш вядомай для метраполіі краінай беларускай дыяспары. Патрэба даследавання наспела даўно, аднак не хапала нейкага апошняга штуршка. Цяпер жа ўсё нарэшце склалася, і пасля напісаных ужо мною кніг пра беларусаў Аўстраліі і Брытаніі яшчэ адзін дамініён у гэтым шэрагу выглядаў бы цалкам лагічна. З такімі думкамі і свядомасцю я пачынала сваё падарожжа ў новую беларускую краіну.

## Беларуская Атава

Першым горадам, дзе я затрымалася і спаткалася з беларусамі, была Атава — прыгожая, але невялікая сталіца даволі вялікай дзяржавы. Тут, як належыць галоўнаму ўрадаваму гораду краіны, выдатна выконваецца прынцып дзяржаўнага двухмоўя: усе надпісы робяць на двух мовах, супрацоўнікі ўстановаў вітаюць цябе на двух мовах, і нават прыпынкі ў аўтобусах можна пачуць і па-англійску, і па-французску. Цікава, што варта пераехаць раку Атаву, і трапляеш у іншы горад — Гаціно, што знаходзіцца ўжо ў франкафонным штаце Квэбэк. Тут французскія надпісы папярэднічаюць англійскім і вылучаюцца большымі літарамі.

Арганізаванае беларускае жыццё ў Атаве пачалося пазней за іншыя канадскія гарады — ад 1970-х, калі сюды з Іспаніі перабралася сям'я Янкі і Івонкі Сурвілаў. Доўгі час менавіта яны і складалі аснову Атаўскага аддзелу Згуртавання беларусаў Канады. Жывучы ў сталіцы, дзе размешчаныя ўсе ўрадавыя ўстановы, Сурвілы асноўным кірункам сваёй дзейнасці абралі вонкавыя сувязі: яны рэпрэзентавалі беларусаў на розных шматкультурных імпрэзах, мелі сталую карэспандэнцыю з урадоўцамі і палітыкамі па беларускіх пытаннях. З іх ініцыятывы і ўдзелам у Атаве ладзіліся науковыя і культурныя мерапрыемствы беларусаў. Пазней менавіта тут былі створаны Чарнобыльскі фонд, што займаўся арганізацыяй прыезду беларускіх дзяцей з забруджаных радыяцыяй рэгіёнаў на адпачынак у канадскія сем'і. Пра ўсё гэта я пачула ад самой удзельніцы ўсіх згаданых ініцыятываў Івонкі Сурвілы.

У 1990-х у Атаве асела багата прадстаўнікоў новай хвалі эміграцыі. Шмат сярод іх было праграмістаў, што былі запатрабаваныя ў Канадзе. Спаткала я тут і прадстаўнікоў іншых прафесій: доктара медыцынскіх навук Пётру Мурзёнку і кандыдата хіміка-біялагічных навук ягоную жонку Наталлю, кандыдата філалагічных навук Ірыну Лысенку і іншых. Менавіта з гэтымі людзьмі, шмат з якіх прафесійна адбыліся і былі паспяховымі яшчэ ў Беларусі, звязаны працяг беларускага жыцця ў канадскай сталіцы. І тое, што гэтае жыццё сапраўды працягваецца, я змагла ўпэўніцца ў першы ж дзень свайго знаходжання тут, трапіўшы на святкаванне ўгодкаў беларускай незалежнасці.

Аднак найважнейшым пунктам маёй цікавасці ў Атаве былі не толькі людзі. Тут у Нацыянальным архіве Канады захоўваюцца беларускія фонды, з якімі дагэтуль ніхто з даследчыкаў не працаваў. Гэта фонды прыватных асобаў і арганізацый. Адным з першых невялікі стос сваёй карэспандэнцыі аддаў пісьменнік Кастусь Акула. Пазней сюды трапіў архіў іншага беларускага пісьменніка і грамадскага дзеяча з далёкага Вініпегу Міколы Сільвановіча. Адразу пасля смерці доктара Яна Садоўскага, кіраўнік славянскага аддзела архіву ўкраінец паводле паходжання Майран Момрык далучыў да калекцыі шматлікую і разнастайную дакументальную спадчыну гэтага навукоўца. З часам тут апынуліся паперы Раісы Жук-Грышкевіч (у тым ліку і вялікія архівы Згуртавання беларусаў Канады і Каардынацыйнага камітэта беларусаў Канады), Язэпа Баброўскага (архіў Беларускага нацыянальнага аб'яднання), ну і найбольш вядомы і нават легендарны ў нечым фонд беларускага літаратара і грамадскага дзеяча Сяргея Хмары.

Згаданыя зборы дакументаў з'яўляюцца сапраўднымі скарбамі для даследчыкаў не толькі канадскай дыяспары. Тут утрымліваецца карэспандэнцыя беларусаў з шматлікіх замежных асяродкаў, а таксама перыёдыкі з розных краінаў свету. Не трэба казаць, з якім задавальненнем я цягам амаль месяца пераглядала адзначаныя дакументы, што стануць асновай будучай кнігі.

## Беларускі асяродак Манрэаля

У сваёй архіўнай працы ў Атаве я зрабіла невялікі перапынак, каб наведаць Манрэаль. Цікава было пабачыць другі па велічыні франкамоўны горад свету.

Найбуйнейшы горад штату Квэбэк, вядомы сваім універсітэтам, портам, саборам Нотр-Дам, алімпійскім стадыёнам ды хакейнай камандай, быў некалі яшчэ і цэнтрам беларускага жыцця. Згуртаванне беларусаў Квэбэку было вядомае найперш сваімі мастацкімі калектывамі. Найбуйнейшы з іх — мужчынскі хор «Жалейка», што складаўся з двух дзясяткаў беларускіх спевакоў, запісваў у 1950-х кружэлкі з беларускімі песнямі. Яго выступы можна было пачуць на нацыянальных мерапрыемствах і ў Манрэалі, і ў іншых канадскіх і амерыканскіх гарадах.

Доўгія гады галоўнымі дзеючымі асобамі беларускага жыцця ў Манрэалі была сям'я Анатоля Храноўскага, чацвёра дзяцей якога, народжаныя ўжо ў Канадзе, былі пастаяннымі ўдзельнікамі ўсіх нацыянальных мерапрыемстваў. Сам Храноўскі і яго жонка-полька, што добра размаўляе па-беларуску, ужо колькі гадоў выдаюць адзіны ў Канадзе рэгулярны беларускі перыёдык — квартальнік пад назвай «Прамень». Спадар Анатоль да сёння застаецца ідэалістам, як і раней, марыць набыць беларусам свой куток, каб была там грамадская зала, бібліятэка, царква. Праўда, жыве сям'я беларуса ўжо не ў Манрэалі, а ў невялікім горным гарадку Сатан, на мяжы з ЗША, але сувязяў з манрэальскімі беларусамі не парывае. Хоць са старой эміграцыі засталіся ўжо лічаныя асобы, а новая пакуль болей занятая ўладкаваннем і вырашэннем сваіх эканамічных праблемаў.

Сучаснасць беларускага асяродку ў Манрэалі даволі няпэўная. У гэтым годзе мясцовыя беларусы не змаглі сабрацца на традыцыйнае сакавіковае святкаванне. На жаль, не мела магчымасці і я спаткацца з іншымі манрэальскімі беларусамі. Але хочацца спадзявацца, што багатая гісторыя гэтага беларускага асяродку не скончыцца і будзе мець працяг, трэба толькі пачакаць.



Беларускі сцяг ля гарадской ратушы ў Таронта, упершыню ўзняты ў 1970 г.



Беларускае святкаванне ў Таронта 1971 г.

## Беларусы Таронта

Скончыўшы свае архіўныя справы ў Атаве, я вярнулася ў Таронта. Гэты горад — цэнтр штата Антарыё — ужо больш за шэсць дзясяткаў гадоў з'яўляецца сапраўдным цэнтрам беларускай Канады. Таронта сёння — месца канцэнтрацыі эмігрантаў розных нацыянальнасцяў. Тут ёсць польска-ўкраінскі, рускі, габрэйскі, кітайскі і іншыя нацыянальныя раёны, а таксама абсалютна інтэрнацыянальны прыгожы цэнтр гораду з традыцыйнымі для сучасных мегаполісаў хмарачосамі і вялікімі гандлёвымі цэнтрамі, асартымент якіх не асабліва адрозніваецца ад нью-ёркскага ці лонданскага — яскравыя адзнакі глабалізацыі.

Менавіта ў Таронта ў 1948 годзе было заснавана Згуртаванне беларусаў Канады, што да сёння застаецца найбуйнейшай беларускай арганізацыяй у гэтай краіне. З часам у згуртавання з'явіўся свой дом — будынак, дзе месціцца Беларускі грамадска-рэлігійны цэнтр. Тут ёсць зала для правядзення нацыянальных мерапрыемстваў, а таксама невялікая праваслаўная капліčка Св. Кірылы Тураўскага, дзе штотыдзень праводзіць беларускія набажэнствы епіскап Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы Святаслаў.

Гісторыя беларусаў Таронта ведае шмат цікавых момантаў: гэта і беларускія песні, што ў

1950-х перыядычна гучалі на мясцовым радыё, і беларускія выставы ды цэлыя павільёны на рэгулярных шматнацыянальных фестывалях «Караванах» у 1970-х, і рэгулярныя сустрэчы беларусаў Паўночнай Амерыкі, што час ад часу праводзіліся ў гэтым канадскім горадзе, і беларускія перыёдыкі, і цэнтр адпачынку «Слуцк» на прыгожым возеры, і шмат іншых цікавых ініцыятыў.

Ведае беларуская гісторыя Таронта і вялікі палітычна-рэлігійны падзел, у выніку якога ад 1952 годзе ў горадзе дзейнічалі дзве канкуруючыя беларускія арганізацыі: побач са Згуртаваннем беларусаў Канады (ЗБК) з'явілася створанае часткай ягоных былых сябраў Беларускае нацыянальнае аб'яднанне (БНА), а пры ім і асобная беларуская царква Св. Ефрасінні Полацкай. Час вызначыў так, што БНА не мела такой працяглай гісторыі, як ЗБК, але царква існуе і да сёння. Праўда, акрамя назвы нічога беларускага тут, на жаль, не засталося: маладая беларуская эміграцыя ў гэтую царкву не прыйшла, а новы святар-украінец стаў гуртаваць вакол сябе выхадцаў з усяго былога СССР. На мясцовыя набажэнствы прыходзяць і рускія, і украінцы, і грузіны, і малдаване, і іншыя. Няма толькі беларусаў, таму з прыгожай царкоўнай залі папрыбіралі і беларускую сімволіку, і партрэты беларускіх класікаў.

У Таронта была яшчэ і асобная групоўка беларусаў, якую называлі «хмараўцы». Яе лідар пісьменнік Сяргей Хмара выступаў супраць палітычнага падзелу беларускай эміграцыі і ў выніку ,не далучыўшыся ні да адной з групаў, стварыў сваю — «трэцюю сілу». Ён меў прыхільнікаў у розных краінах, і іх допісы можна пабачыць на старонках выдаваный Хмарам газеты «Беларускі голас». Гэты перыёдык, што выходзіў цягам сарака гадоў — ад 1952 да 1992-га — стаў адным з найбольш працяглых беларускіх выдавецкіх праектаў на Захадзе, а рабіў яго пераважна адзін чалавек — сам Сяргей Хмара. Акрамя таго, ён стаў заснавальнікам Канадскага клуба этнічных журналістаў і пісьменнікаў, а ягоная дачка Магдалена сёння з'яўляецца нацыянальным віцэ-прэзідэнтам адной з канадскіх тэлекампаній.

Сам падзел і яго носьбіты сёння ўжо адышлі ў нябыт і пакінулі па сабе знакамі хіба што помнікі на могілках. Спецыяльных беларускіх дзялянак на могілках канадскія беларусы не куплялі, магчыма таму, што прыязджалі яны сюды яшчэ маладымі і думаць пра гэткія праблемы ад пачатку не хацелі, потым жа было цяжэй. У выніку беларускія магілы можна знайсці часта на вялікіх украінскіх могільніках. Збіранне звестак пра беларускія пахаванні — яшчэ адна цікавая сфера даследчай дзейнасці.

Але беларускае жыццё ў Таронта не скончылася з адыходам старых беларусаў. Даволі багатым на падзеі яно застаецца і сёння. Ужо каля 10 гадоў тут дзейнічае спеўны гурт «Яваровыя людзі», створаны і кіраваны былой журналісткай «Нашай нівы» Віялетай Кавалёвай. Выдаецца (праўда, не вельмі рэгулярна) газета «Беларускае слова». Тут праводзяцца беларуская мерапрыемствы рознага фармату. Прыкладам, у гэтым годзе святкаванне ўгодкаў 25 сакавіка тут адбывалася ў выглядзе вялікага мітынгу на гарадской плошчы з удзелам канадскіх палітыкаў.

### Іншыя беларускія месцы

У часы росквіту Згуртавання беларусаў Канады ягоныя аддзелы былі ў Садбуры, Лондане, Гамільтане, Ашаве. Асобным беларускім цэнтрам быў таксама далёкі Вініпег. Аднак з часам згаданыя асяродкі спынілі сваё існаванне. Ёсць асобныя сем'і: так, у антарыйскім Лондане яшчэ жыве Людміла Рагуля, жонка вядомага беларускага дзеяча і таленавітага доктара Барыса Рагулі, у Кінгстане жыве жонка Алеся Грыцкуа, аўтара дысертацыі, прысвечанай Максіму Багдановічу, Вольга Грыцук. Ва ўніверсітэце Ватэрлоа працуе прафесар-беларусіст Зіна Гімпелевіч. Асобныя сем'і старой эміграцыі і прадстаўнікі новай ёсць у Вініпегу. Магчыма, калісьці беларускае жыццё адновіцца ці народзіцца і ў іншых месцах Канады.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# ВІВАТ, «ДУДАРСКІ ФЭСТ»!

Анатоль МЯЛЬГУЙ

**Юбілейны дзясяты «Дударскі фэст» стаў добрай падставай для асэнсавання ролі гэтай папулярнай імпрэзы ў сучаснай беларускай культуры. Незалежная музычная дзея, імя якой даў яе заснавальнік, дудар і майстра Тодар Кашкурэвіч, спрыяла таму, што дударскі рух Беларусі набыў рысы трывалай айчыннай культурніцкай з'явы.**

### Думкі напярэдадні

Дзякуючы фэсту ў нашай краіне з'явіўся цэлы шэраг таленавітых выканаўцаў — гуртоў і капэлаў, хлопцаў і дзяўчат, нават дзетак! Іх талент мае матэрыяльнае падмацаванне: у краіне працуюць нямала дастаткова спрактыкаваных майстроў, якім пад сілу ажыццявіць любыя мары выканаўцаў — зрабіць якасны інструмент для канцэртаў і студыйных запісаў. Дзякуючы «Дударскаму фэсту» нашы выканаўцы навучыліся граць у вялікіх канцэртных залах і на свежым паветры, у гуртах і сольна, імправізаваць пад электронныя рытмы ды-джэяў. Стала працуе «Дударскі клуб» — месца сустрэч і абмену вопытам дудароў, прыхільнікаў медыевальнай культуры. А адзін з заснавальнікаў цяперашняга «Дударскага фэсту» Зміцер Сасноўскі выдаў грунтоўны твор «Гісторыя беларускай музычнай культуры ад старажытнасці да канца XVIII ст.», які застаецца адзіным дапаможнікам для навучэнцаў дзяржаўных музычных установаў і даведнікам для аматараў сярэднявечнай музычнай культуры Беларусі.

Пра гэтыя вехі развіцця айчыннай дударскай школы думалася, калі арганізатары абвясцілі пра дзясяты юбілейны «Дударскі фэст», на які былі запрошаны шмат гасцей з усёй Еўропы. Дзеля гэтага былі задзейнічаны магчымасці амбасадаў Германіі і Швецыі, сяброў з Польскага інстытуту ў Мінску. Ды і сам фэст ператваўрыўся ў шматдзённы музычны марафон, у якім удзельнічалі і гаспадары імпрэзы, і госці нашай краіны. Адной са знакавых падзеяў «Дударскага фэсту» стаў сольны канцэрт шведскага медыевальнага гурта «Hedningarna», а таксама ўнікальны канцэрт гурта «ESSA», кіраўніком якога з'яўляецца заснавальнік і адзін з гуру айчыннага дударскага руху, майстар і дудар Тодар Кашкурэвіч.

Але па традыцыі «Дударскага фэсту» самыя цікавыя музычныя сустрэчы, самыя «ўдарныя» выступленні былі назапашаны на апошні дзень імпрэзы. Вось і канцэрт у сталічным клубе «Рэактар» не стаў выключэннем з правілаў: маладыя людзі, якія запоўнілі танцпол клуба, спадзяваліся на сустрэчы з унікальнымі выканаўцамі, а таксама на тое, што змогуць патанчыць пад еўрапейскія мелодыі, сустрэцца сам-насам са сваімі кумірамі з роднай Беларусі...



«Fidelius»

### Ад «Боны Сфорцы» да «Кашлатага Воха»

Першымі на сцэну «Дударскага фэсту» вядучы Зміцер Сасноўскі запрасіў не надта знаёмы слухачам медыевальны гурт «Бона Сфорца». Пры больш пільным разглядзе аказалася, што гуртом кіруе і саліруе вядомая выканаўца на дудзе, лідар жаночага гурта «Расалія» Аксана Касцян. Цяпер у складзе гурта «Бона Сфорца» былі заўважаны хлопцы, якія сваім незвычайнымі інструментамі надалі гучанню больш экспрэсіўнасці і музычных фарбаў. Рэпертуар гурта «Бона Сфорца» нечым нагадваў «расаліеўскі» — шмат танцавальных мелодый («Базар», «Лявоніха»), апрацоўкі еўрапейскага фальклору, аўтарскія кампазіцыі («Светавіт»). Як заўсёды, зоркай канцэрта стала сама Аксана. Яе выканаўчае майстэрства, як і заўжды, было з захапленнем сустрэтае слухачамі.

Наступны ўдзельнік «Дударскага фэсту» — шоў-гурт «Яварына», які завяршае свае пераўтварэнні ад гурта-акампаніятара аднайменнага тэатра танца да паўнавартаснага медыевальнага калектыву. Цяпер цэнтрам музычнага дзеяння, якое адбывалася падчас канцэрта гурта, з'яўляецца інструмент нямецкага паходжання — дудэльзак, на якім грае вядомы па канцэртах «Дударскага клуба» Зміцер Шыманскі. Асабліва ўдаюцца музыкантам «Яварыны» апрацоўкі балканскага фальклору.

Вось хто па-сапраўднаму вылучаўся сваім неардынарным стаўленнем да дударскіх традыцый, дык гэта гурт «Кашлаты Вох»! Кожны раз, прадстаўляючы гэтых музыкантаў, вядучы «Дударскага фэсту» З. Сасноўскі адзначаў, што музыканты «Кашлатага Воха» з'яўляюцца пачынальнікамі новага напрамку ў фолк-музыцы — псіха-фолка. Хоць на самай справе ў музыцы гурта заўважныя элементы фолк-рока, панка і псіхадэліі, а цэнтрам канцэртнай дзеі з'яўляецца сцэнічны перформанс, які ладзіць з дапамогай дуды фронтмэн гурта В. Красулін. І гэты падыход знаходзіць водгук у слухачоў: з кожным канцэртам папулярнасць гурта расце, як расце і выканаўчае майстэрства маладых музыкантаў.

### «Fidelius»: дастыш фантастыш!

Пасля такога энергічнага «разагрэву» публікі фестывалю быў патрэбен сапраўдны эмацыйны «выбух». І гэты выбух забяспечылі нямецкія госці з медыевальнага гурта «Fidelius», якія ўпершыню выступалі ў нашай краіне. Адзначу, што гурт «Fidelius» — трыа, у складзе якога выканаўцы на флейтах, бубне і нямецкай цыстры. Удзельнікі гурта дасканала валодаюць прыёмамі старажытных нямецкіх скамарохаў, якія весялілі сялян і гараджан на кірмашах і народных святах. Элементы гэтых скамарошных забаў былі прадэманстраваны ў праграме гурта «Fidelius», што адбілася і на прыёме іх музыкі беларускімі слухачамі. Іх рытмічныя і адначасова меладычныя найгрышы, бытавыя і павучальныя балады сталі добрай падставай, каб пусціцца ў безаглядныя скокі па ўсёй зале клуба.

На такім падвышаным эмацыйным фоне гурту «Стары Ольса» заставалася толькі выканаць некалькі сваіх хітоў, каб слухачы віталі іх, як і нямецкіх музыкантаў з «Fidelius». Таму прагучалі такія вядомыя песні, як «Вітаўт», «Літвін», творы з «Полацкага сшытка» — «Немец», «Дрыгула», а таксама кампазіцыя «У карчме», што была прысвечана клубу, у якім адбываўся заключны канцэрт «Дударскага фэсту». Гэтым разам музыканты «Старога Ольсы» вырашылі скарыць публіку не толькі знакамітымі песнямі, якія добра вядомы слухачам. Асабліва шчыраваў Зміцер Сасноўскі, які ў гэты вечар паказаў шмат унікальных выканаўчых прыёмаў ігры на дудзе.

### Пад дэвізам Open Europe

Музыкантаў з гурта «Open Folk» слухачам прадстаўлялі супрацоўнікі Польскага інстытута ў Мінску, якія маюць вялікі вопыт супрацоўніцтва з арганізатарамі «Дударскага фэсту». З дапамогай Польскага інстытута беларускія слухачы пазнаёміліся з аўтэнтычнымі выканаўцамі Польшчы — гуртамі «Dudziarzy Wielkopolski» і «Kapela kozlarska Benia Kaspra z Przyprostyni», якія ўпершыню прадэманстравалі гуральскія дударскія традыцыі суседняй краіны краіны. Гэтым разам госцем «Дударскага фэсту» стаў гурт «Open Folk», у складзе якога былі заўважныя не толькі старажытныя польскія смыковыя інструменты, але і іспанскія дуды — гаіты. Гук гэтых інструментаў добра стасаваўся з еўрапейскай дудовай музыкай, якая з'яўляецца асновай рэпертуару польскіх медыевальных выканаўцаў. Былі выкананы сюіта паводле французскіх музычных твораў для дуды XVIII стагоддзя, а таксама сюіта з польскіх народных танцаў гэтага ж гістарычнага перыяду. У рэпертуары «Open Folk» не толькі музыка Сярэднявечча, але і больш познія творы, якія адносяцца да эпохі барока.

Думаю, залішне нагадваць нашым чытачам тое, як сталічныя меламаны любяць экстрэмальныя рытмы дударскага рок-гурта «Litvintroll»! Гэтым вечарам усё паўтаралася наноў: слухачы, нягледзячы на позні час, з нецярпеннем чакалі сваіх улюбёнцаў. Тыя, адчуваючы адказнасць перад прыхільнікамі, пастараліся выкласціся на ўсе «сто адсоткаў». На жаль, музыкантам гурта «Litvintroll» хапіла часу толькі нагадаць свае хіты з альбома «Rock'n Troll». Але музыканты «Litvintroll» запрасілі сваіх прыхільнікаў на будучую прэзентацыю новай кружэлкі, якая адбудзецца ўжо, на жаль, не ў гэтым клубе.

*P.S. Самы буйны і аўтарытэтны сталічны клуб «Рэактар» спыняе сваю дзейнасць. Таму самы час падзякаваць нешматлікім працаўнікам клуба і яго дырэктару Андрэю Старцаву, якія спрычыніліся да арганізацыі шматлікіх канцэртаў беларускіх і замежных выканаўцаў, шмат зрабілі для сучаснай беларускай музычнай культуры, айчыннай рок-музыкі ўсіх напрамкаў, для паспяховага правядзення «Дударскага фэсту». Гэта чарговы ўдар па незалежнай беларускай культуры, але мы застаёмся аптымістамі і спадзяёмся на новыя сустрэчы з таленавітай камандай Старцава.*

ПАДЗЕЯ

# НОЧ МУЗЕЯЎ–2011

Аляксей ХАДЫКА

**Ноч музеяў, у першапачатковай назве «Вясна музеяў», — мерапрыемствы, якое ладзіцца ў бліжэйшыя выходныя да Сусветнага дня музеяў (18 мая). Ініцыятыва нарадзілася ў 1997 годзе ў Берліне.**





Восем год акцыю падтрымліваюць і ў Беларусі: пачаўшыся са сталіцы (сёлета ў ёй бралі ўдзел 13 мінскіх музеяў і каля 50 за межамі сталіцы), яна паступова пашырылася на ўсю краіну. Пры гэтым, аднак, страціла свой выключна дабрачынны характар. Што рабіць — у нас крызіс, ды і ў старой Еўропе музеям даводзіцца лічыць грошы, бо нават такія гіганты, як Луўр у Парыжы, не акупляюцца.

Толькі англасаксонская традыцыя, падтрыманая моцнай эканомікай, зберагае прынцып бясплатнага доступу да сховішчаў помнікаў культуры — за выключэннем рэдкіх устаноў, кшталту лонданскіх Музея мадам Цюсо ці галерэі Тэйт. Як падкрэсліў напярэдадні Ночы музеяў намеснік міністра культуры Віктар Кураш, у атрыманні платы за ўваход ёсць рацыянальнае зерне — гэта не толькі заробак музейных устаноў, але і магчымасць надаць дзеянню феерычна-тэатральны характар, запрасіць акцёраў і музыкаў, замовіць касцюмы і дэкарацыі.

Намесніца дырэктара Нацыянальнага мастацкага музея Надзея Усава прыгадала, што ў 2004 годзе, калі на дэбютную праграму начнога мерапрыемства, у той час бясплатнага, музейныя супрацоўнікі запланавалі паказ экзатычнага бодзі-арту, ажыятажны наплыў наведвальнікаў дасягнуў такіх памераў, што «будынак ледзьве не лопнуў». Давялося перыядычна зачыняць дзверы. Што рабіць: у гэтым годзе ў VIP-залу ў Мастацкім музеі, кошт праграмы ў якой склаў 45 тысяч рублёў, бясплатна не пускалі нават самых кіраўнікоў установы.

Парадавала тое, што зусім не танны кошт квітка ў 10 тысяч рублёў на астатнія экспазіцыі (у іншых музеях білеты былі таннейшыя) не спыніў вялізнай плыні тых, хто жадаў трапіць на свята мастацтва. Хвост чаргі загінаўся на вуліцу Маркса ледзьве не да будынка філфака. Гэтым разам у чаканні на ўваход госці не сумавалі: проста на прыступках ля ўваходу ўвесь час гучалі бадзёрыя рокавыя кампазіцыі.

Слоганам дзеяння свята ў Мастацкім музеі ў гэтым годзе было «Прастора жанчыны», а правам на ільготны бясплатны ўваход карысталіся дамы, апранутыя ў кароткія чорныя сукенкі а ля Како Шанэль, з капялюшыкамі і вуалямі і на абцасах. Уся прастора вуліц вакол і інтэр'еры поўніліся прыгожымі дзяўчатамі, якія з зайздросным імпэтам імправізавалі на зададзеную тэму.

Прастору жанчыны, убачаную ў яе часовых і духоўных праявах аўтары сцэнаграфіі дзеі зрабілі ключом для пабудовы сцэнічных пляцовак пад разнастайныя тэатралізаваныя шоў ад тэатра ценяў да разнастайных маскарадаў па ўсіх залах. Тут былі прасторы «Музы», «Часоў года», «Прынцэсы» (натуральна, у зале партрэтнага жывапісу), «Ідала» (пад гэта пасавала мастацтва мадэрну), «Жаночага інтэлекту» і нават «Жаночых забабонаў».

Феміністычная тэма вызначыла і выбар трох выстаў, адкрыццё якіх спецыяльна прымеркавалі да імпрэзы. Гэта была «Графіка Ню» (творы Сяргея Цімохава, Аляксандра Шапо, Андрэя Асташова і Андрэя Басалыгі), фотавыстава Андрэя Шчукіна і Дзяніса Нядзельскага «Копія ўяўнай рэальнасці» і «Кранальная выстава», дзе свае скульптуры прадставіў шэраг творцаў — Алег Варвашэня, Аляксандр Мінькоў, Андрэй Вараб'ёў, Канстанцін Селіханаў і іншыя. Жаночая прыгажосць і прывабнасць увасаблялася ў фантасмагарычным змяшэнні мастацкіх тэхнік і стыляў, эпох і часоў, твораў старога і сучаснага мастацтва, і ажывала ў святочных пастацях шматлікіх наведвальнікаў. Цяжкі, але радасны дзень — або ноч — для гаспадароў музея, шмат з якіх непасрэдна сустракалі публіку ў залах у таварыстве апранутага ў элегантны касцюм міністра культуры Паўла Латушкі.

Плыні вясёлай узбуджанай публікі перамяшчаліся па цэнтральных вуліцах ад Мастацкага музея ў бок Нацыянальнага гістарычнага і ў адваротным кірунку — да Музея Купалы. Першы пераняў неадназова выкарыстаную раней мастацкім музеем ідэю свята «Карцін, якія ажылі» — Вольга Смаляк прадстаўляла 35 карцін Андрэя Смаляка і 35 «фатаздымкаў» вядомых асоб — удзельнікаў праекта. Але і гасцей запрасілі да ўдзелу ў конкурсе «Міс (Містэр) Ноч, якая ажыла» — варта было прынесці рэпрадукцыю адвольнай карціны на ўласны густ і прыйсці ў касцюме, адпаведным адлюстраванню. Як звыкла, у двары музея наладзілі канцэрт — гучалі маладыя беларускія гурты. Рок, блюз, сусветная эстрадная класіка: амаль без папсы. Купалаўскі музей таксама пастараўся напоўніць свае інтэр'еры гукамі музыкі, паставіўшы акцэнт на джазавых кампазіцыях. Пакоі сустракалі сцэнамі побыту купалаўскай эпохі, адмыслова запрошаныя акторы забаўлялі дзяцей.

Музей сучаснага мастацтва здолеў з інтэрваламі ў гадзіну адчыніць чатыры экспазіцыі: беларуска-шведскай карыкатуры «Сам-насам з кліматам», сучаснага польскага жывапісу, фатаграфіі Андрэя Васілеўскага і біжутэрыі… Наведаць усе пляцоўкі музейнага свята ў сталіцы 14 мая было немагчыма!

Калісьці музеі пачыналіся як храмавыя калекцыі. А наведванне святынь у традыцыйнай культуры практыкавалася рэгулярна. Калісьці і сучасны чалавек мусіць прыйсці да высновы, што духоўныя практыкаванні, якімі з'яўляецца паход у музей, не варта абмяжоўваць адным вечарам на год.

ЮБІЛЕЙ

# СКАРЫНА Ў ЛОНДАНЕ

Аляксей ХАДЫКА

**15 мая споўнілася 40 гадоў з дня заснавання Беларускай бібліятэкі і музея імя Францішка Скарыны ў Лондане. Мне пашанцавала патрапіць у гэтую незвычайную ўстанову 15 гадоў таму, калі яе нязменны дырэктар айцец Аляксандр Надсан ладзіў навуковую канферэнцыю да 400-годдзя Берасцейскай уніі.**

Тры тыповыя двухпавярховыя чырвоныя дамкі ў ціхім паўночным раёне Лондана Фінчлі, на вуліцы Холдэн Роўд. У адным — царква, дзе кожны дзень ужо некалькі дзесяцігоддзяў па-беларуску правяцца літургіі і набажэнствы — плён тытанічнай перакладчыцкай і святарскай працы айца Аляксандра. Насупраць — дамок для гасцей. Шмат год тут заўсёды можна спаткаць даследчыкаў-беларусістаў з Беларусі і іншых краін свету, студэнтаў-тэолагаў, маладых паслушэнцаў, якія адраджаюць грэка-каталіцкую беларускую царкву. І, нарэшце, сама бібліятэка і музей — сховішчы каля 40 тысяч старадрукаў, рукапісаў: ад выданняў Скарыны, Статута ВКЛ 1588 года, кніг друкарняў з Куцейны, Вільні, Супрасля, старажытных мапаў да скарбаў XX стагоддзя. Першадрукі Максіма Багдановіча, Канстанцы Буйло, Максіма Гарэцкага, Янкі Купалы, Максіма Танка. Рукапісы Купалы і Коласа, іншых аўтараў, збор даўніх архіўных дакументаў. А таксама творы мастацтва: два слуцкія паясы, манеты і медалі ВКЛ, жывапісныя творы заходнебеларускіх мастакоў на чале з Пятром Сергіевічам, мастакоў-эмігрантаў: Віктара Жаўняровіча, Пятра Мірановіча, Міхася Наўмовіча і іншых.

Мне давялося гартаць тут унікальныя фотаальбомы экспедыцый Вацлава Ластоўскага па Беларусі, копіі якіх былі зроблены для Акадэміі навук, дзівіцца ўнікальнымі перыёдыкамі першай паловы XX стагоддзя і эміграцыйнымі выданнямі. Сам гаспадар-дырэктар бібліятэкі заўсёды ласкава сустракаючы гасцей, дапамагае ім пазнаёміцца з лонданскімі беларускімі зборамі. А пры неабходнасці арыентуе ў сістэме іншых бібліятэк, музеяў, архіваў брытанскай сталіцы.

Пачатак калекцыі беларускай місіі паклалі зборы беларускіх святароў Льва Гарошкі і Чэслава Сіповіча, уласна яе заснавальніка, дапоўнілі ахвяраванні і закупы на аўкцыёнах. Тут заўсёды пануе шчырая і сяброўская



Фота hardzin.livejournal.com

атмасфера супольных малітваў, сняданкаў і вячэраў, шчырай адкрытасці і ўзаемадапамогі. Нават канферэнцыі і сустрэчы, якія адбываюцца звычайна разам з Англа-беларускім навуковым таварыствам і пры ўдзеле сяброў Згуртавання беларусаў Вялікай Брытаніі праходзяць бы таварыскія сустрэчы. І вядзецца вялікая навуковая праца.

Як не прыгадаць ужо памерлага знаўцу беларускай музычнай спадчыны Гая Пікарду, як не сказаць ухвальнае слова заўсёды шчыраму айцу Аляксандру, які ў гэтым годзе 8 жніўня адзначыць сваё 85-годдзе. Дай Бог здароў'я і сіл, якіх пакуль, здаецца, столькі, што яго энергіі творчай працы пазайздросцілі бы і маладзейшы чалавек. Святарская, тэалагічная, навуковая дзейнасць, якая кіруецца з Бібліятэкі і музея Скарыны — не поўны пералік таго добрага, што робіцца для беларусаў і беларускай царквы ў Лондане. Беларускім камітэтам дапамогі ахвярам радыяцыі ў Вялікабрытаніі, адной з першых ініцыятыў у замежжы, якая з 1989 года рэгулярна аказвае неацэнную дапамогу пацярпелым ад Чарнобыля ў нашай краіне, таксама кіруе айцец Аляксандр Надсан.

Выказваючы шчырыя віншаванні з юбілеем, хочацца спадзявацца, што недалёкі той час, калі беларуская дзяржава пачне сплочваць свае пазыкі тым людзям і ўстановам, якія зберагаюць дух і спадчыну нашага народа за яе межамі.

Новы Час
Агульнапалітычная штотыднёвая газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар
**Кароль Аляксей Сцяпанавіч**

Зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі РБ. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.

**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.

**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў». Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220113, г. Мінск, вул. Мележа, 1–1234.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 268 52 81.
novychas@gmail.com; www.novychas.org

**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет». г. Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова № 542

Падпісана да друку 20.05.2011. 8.00.
Наклад 7000 асобнікаў. Кошт свабодны.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы. Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.